Усе мы целам сваім і справамі нашымі падлягаем д'яблу, бо мы толькі госці на свеце, дзе ён ёсць панам і богам. Таму ў яго ўладзе хлеб, які з'ядаем, пітво, якое п'ем, вопратка, якую носім, а нават паветра, карацей, усё, чым жывем.

Марцін Лютар, "Каментар да Галатаў", раздзел 3

Адам і Ева не для таго былі створаныя,
Каб кланяцца князю і ўладару той зямлі.

Другая, сонечная зямля трывала ў часе.
Яму і ёй дадзена на вечнае шчасце.

Сівабароды садоўнік даглядаў на ёй дрэвы,
Хоць свет так і не блішчаў, як садоўніку трэба.

Глядзеў ён скрозь дні і вякі, як праз аптычную трубу,
На сваю справу, так добра пачатую.

Але справа тая праз віну спазнання замяніцца мела
У ненасытнасць душы і падатнае ранам цела.

Папярэджваў іх, але ведаў, што гэта не дапаможа,
Бо гатовыя ўжо яны да свайго падарожжа.

Нябачны ў лістоце, думаў ён, поўны смутку,
Бачыў агні і масты, караблі, дамы і чыгунку.

Самалёт у небе начным мільгацеў іскрою,
Ложы ў спальнях бачыў і трупы на полі бою.

О, бедныя мае дзеці, куды вы спяшыце, да жвіру,
дзе чэрап жоўтыя зубы вышчэрвае шчыра?

Дзе хаваюць лыткі ў трусы, крыналіны,
Дзе далей адкрываюць наступствы, прычыны?

Вось надыходзіць мой вораг, і зараз вам скажа:
Паспрабуйце, і божаму будзе роўнае жыццё ваша.

Добра ў злачынстве з любоўю самім сабе слугам,
Ну, сапраўдныя богі, толькі з жабрацкім духам.

Няшчасныя мае дзеці, доўгі шлях вам наканаваны,
Пакуль ізноў заквітнее сад зруйнаваны.

І вернецеся да ганку ліпавай алеяй,
Дзе кветнік пахне чаборам і шалфеем.

Ці так было трэба правальвацца ў бяздонне,
Шукаць сістэмы, парадку, замест у казцы жыць, як у доме.

Над якім домам заўсёды мая апека?
Бо праўду кажа Пісанне, што ў мяне твар чалавека.

АДЗІН І МНОГА

Лічбу адну Князь Таго Свету множыць,
А кожны асобна ёсць пад апекай Божай.
Майстар выключэнняў і Пан выратаванняў
Жыў ад пачатку ў маіх блуканнях.

Адзін; табліцы множання супраць.
Дакладны, свабодны ад абагульвання.
Без рук, без вачэй, аднак існуе сапраўды.
Нябачны, схаваны, але заўжды там, дзе ты.

Няхай нас не страшыць ні шлях змарнаваны,
Ні пячоры цмокаў, турмы, кайданы,
Ні пад слаямі гною мурашнік штодзённы,
Ані адлеглых галактыкаў выгляд цёмны.

Бо голас чалавечы нястомна трывае
І песні хвалы і гневу спявае.
І нам неабходныя ўсе без вынятку рэчы,
І чужыя, і прыгожыя, няхай мы сабе і пярэчым.

АЛКАГОЛІК УВАХОДЗІЦЬ У НЯБЕСНУЮ БРАМУ

Якім я буду, я ведаў ад пачатку.
І ад пачатку кожнай жывой істоты.

Гэта жахліва, мець такую свядомасць,
дзе існуюць у адным часе
ёсць, будзе і было.

Жыць пачынаў я даверлівы і шчаслівы,
упэўнены, што гэта для мяне штодзень усходзіць сонца
і ранкам распускаюцца кветкі.
Ад раніцы да вечара бегаў па садзе зачараваным.

Нічога не ведаючы, што Ты з Кнігі Генаў
выбіраеш мяне для новага эксперыменту,
як быццам мала было доказаў,
што гэтак званая вольная воля
не здольная ісці насуперак прызначэнню.

Цярпеў я пад тваімі распешчанымі вачыма,
як чарвяк, жыўцом насаджаны на церневы шып.
Адкрываўся мне страх і жах таго свету.

Ці мог я не ўцякаць ад яго да сваіх мрояў?
Да атруты, праглынуўшы якую стамляешся скрыгатаць зубамі,
расцякаецца куля, што цяжарам душыць грудзі,
і можаш сабе думаць, што і ты яшчэ пажывеш, як усе?

Неяк я зразумеў, што толькі блукаю ад надзеі да надзеі
і запытаў Цябе, Усёведаючы, чаму
ты мяне мучыш. Ці гэта выпрабаванне, як у Гіоба,
пакуль не ўзнаю я веру маю за міраж
і скажу: няма ні Цябе, ні тваіх прысудаў,
бо адзін толькі выпадак светам кіруе?

Як можаш глядзець
на адначасовы, на міліярды памножаны боль?
Уважаю, што тыя, хто з гэтай прычыны не могуць паверыць,
што Ты ёсць, аднае пахвалы ў Тваіх вачах заслужылі.

Можа, яшчэ і таму, што літасцівы Ты быў без меры, ступіў
на зямлю,
каб самому спазнаць, што адчуваюць смяротныя істоты.

Ты цярпеў пакуты ўкрыжавання за грэх — але чый грэх?

Дык вось, малюся да Цябе, бо не маліцца не ўмею.

Бо сэрца маё Цябе прагне, хоць і ведаю, што Ты мяне не вылечыш.

І так мае быць, каб тыя, хто церпяць, далей цярпелі,
Імя Тваё праслаўляючы.

АБРАД

Так, Вераніка, усё так. Не ў спакоі тут справа.
Хутчэй у паблажлівасці да сябе і іншых.

Не трэба вымагаць ад людзей
Добрацей, для якіх не яны створаны:
Гармоніі разумення, асноваў веры,
Дзе адна не супярэчыць другой, згоды
Паміж учынкамі і верай, пэўнасці сябе.

Здавалася б, людзі ажно празрыстыя, відаць іх наскрозь,
А там цёмныя сілы, што клубяцца як дым.
Цяпер думаю пра Юрку, Афанасія, Кацю,
Бо ніхто не ўзгадае пра іх да Суднага Дня.

Што тут складанага! Лінія лёсу
Расшчапляецца, падскоквае, кідаецца ў бок,
Але ў чалавечай памяці застаецца як адна.
Аднойчы сказаныя словы ўжо ім прыпісаныя,
Хоць самі яны не прызналіся б да тых словаў.
І калі нават хацелі прадставіць доказы,
То нічога з таго не выйшла, бо дзе ім да праўды.

Вось такія стаялі тады на каленях у нашым касцёле,
Паміж калонаў з залатой акантоўкай наверсе,
Зграбных анёлаў, чые тонкія трубы
Абвяшчаюць так вялікую вестку, што не ўлазіць у наш розум.

Кароткая наша ўвага, кажа тут Вераніка.

А думка мая вяртаецца, нягледзячы на літургію,
Да люстэрка, ложа, тэлефона, кухні,
Няздольная ўзняць места Ерусалім
З-пад дзвюх тысячаў гадоў і крыві на крыжу.

Але плаўна ляцім, хоць абцяжараныя
Пахам соуса, крыкам у вузкіх вулічках,
Кавалкам мяса ў вітрыне мясной крамы.
Так ляцім, уздымаемся над алтаром, касцёлам, местам,
Аблятаем усю віруючую Зямлю.

І яны, Вераніка, нашы блізкія,
Побач, на той самай лаўцы, бо іх свядомасць
Гэта мая свядомасць. Вось і ўся таямніца.
Міласэрнай перамены маяго "я" на "мы".

"Бо вы соль зямлі, вы святло зямлі" —
Так сказаў і паклікаў нас да свае хвалы,
Пераможца непадуладнага нікому закона гэтага свету.

Ведаю, што паклікаў — кажа Вераніка.
Але што з тымі, хто не выйшаў з сумневу?
Ці ж яны даюць доказ,
Калі маўчаць — з любові да Яго імя?

А можа, пачнем абагаўляць камень,
Звычайны камень ля палявой дарогі, сам яго Побыт,
І памолімся, не адкрываючы вуснаў?

АСОБЫ

Быў ён адзіным паэтам свайго малога народу.
Бо да яго ніхто не ўмеў закаручку на паперы паставіць.

Запісваў ён закляцці шаманаў і аповесці пра пачатак:
Пра нейкіх людзей, што нараджаліся з кветак

І мелі крылы, і тыя крылы былі крыніцай святла.
А на небе не было аніякага святла ўвогуле.

Потым з'елі яны знойдзены корань, спазналі грэх
і страцілі свае крылы, і зрабілася цемра.
Але прасілі яны, і на просьбу тую зрабілі ім сонца і месяц.

Думаў ён: што ж перакласці на сваю мову?
Гамера? Біблію? Маркіза дэ Сад? Рыльке?

Альбо толькі скласці гімн свайго народа
Ды выдумаць штандар з выявай мядзведзя.

***

Аднак я разважаю пра слабасць мовы.
Я надта стары, і разам са мной знікнуць словы невымаўленыя,
У якіх маглі б жыць, як у доме, тыя асобы, хто даўно памёр.
А я не ўмеў справіцца з тым, каб са словаў
Выглядалі яны авалам твару, формай брывоў, колерам вачэй,
Так і вандруюць яны, размінаюцца са мной недзе ў даліне.
Ледзь-ледзь адасобленыя ад неабсяжнага тлуму
Сагоддзяў, моваў і пакаленняў.

І ты З імі, Клаўдына, што так да мяне пісала:
„Ты для мяне па-ранейшаму як нейкае дзіця
(можа, паэты такія ажно
да канца), як нехта такі, каму выбачаеш усе выбрыкі і кахаеш яго
пры ўсіх браках і недахопах".

Той, кім я быў, бачыць бярозавы лес і нас абоіх у тым лесе,
І лавы ля стала на вячэры ў суседзяў.
Амаль як з прычыны нашага вяселля, але што толку так позна
складаць
гісторыю жыцця.

Цябе таксама клічу, Раксана, хоць таксама ж не хацеў бы
нацкоўваць біёграфаў на твой след.

Спачатку б'ецца сэрца, калі імя прагучыць, а потым толькі тое,
што былі сабе неяк мужчына і кабета, як усе, у вяках
ператвораныя.

Праз гады маглі б ты і я ў нейкім партовым месце
сядзець у бары І ўзгадваць той чароўны час.

І я б расказаў табе ўсё, што зразумеў,
хоць зразумеў мала.

Зразумеў, што сапраўдная мілавіца чамусьці хаваецца
ў масках каханкаў.

Зразумеў, што насуперак сваёй волі мы пакідаем тых, каго
сапраўды
любім, і асуджваем іх на смерць ад холаду.

Або заўсёды ты, Вераніка. Ажно дрыжу, калі тваё сапраўднае
імя вымаўляю.
Былі мы два караблі ў імгле, не бачыла мяне і цябе я не бачыў.

Трагедыя спазнання, чым віна адрозніваецца ад памылкі,
ужо завальваецца дзесьці паміж безназоўных здарэнняў.

Праўда, былі мы маладыя, не верылі, што гэтак проста
ўсе няшчасці здарацца з намі, з людзьмі высокага розуму.

Зараз буду там, у вас і з вамі разам, на раўнінах падземнага Краю,
і ты моўчкі сустрэць мяне выйдзеш.

Што можа быць за размова тых двух, што размінуліся, калі не маю
нічога ў сваю абарону па-за спісаныі старонкамі маіх твораў.

Але чую хор, магутны, грыміць, далучаюся і спяваю
з іншымі разам.

Наш хор грэшнікаў, мужчынаў і кабетаў, што перагортваюць
старонкі партытуры ў сонцы — як там, на зямлі.

З палёгкай думаю, што не быў я лепшы ці горшы многіх
і што разам з імі даравання грахоў чакаю.

А з усіх бакоў напіраюць плямёны, без ані голасу, і нявінная
трава заплятае намагільныя пліты.

У ПАРАФІІ

Каб не быў я крохкі, пасярэдзіне пераламаны,
Не думаў бы пра іншых — гэтак, як я, пераламаных пасярэдзіне.
Не выбраўся б на шпацыр на пагорак, на цвінтар ля касцёла,
Каб пастарацца пазбыцца спачування самому сабе.
Шалёныя Зоські, прайграўшыя ўсе бітвы Казюкі,
Замучыўшыя самі сябе Агаты
Ляжаць пад крыжамі з годам нараджэння і смерці. І хто ж
Цяпер за іх скажа? Хто ведае іх нараканні, плачы, надзеі, слёзы
Пакоры? Тыя самыя ў слізні, у смярдзючай мачы,
У шпітальным сораме перакручанага цела.
І адразу вечнасць. Не да ўжытку. Непрыстойная нават.
Як батлейка, пераеханая коламі воза; як слон,
Які топча хрушча; як акіян, які праглынае астравок.
То праўда, што дзіцячая дурната нас усіх
Ёсць адной непавагай да рэчаў апошніх ці скрайніх.
Не мелі мы часу, каб хоць што зразумець
У побыце хоць адной асобы.
У яе principium individuationis,
І я таксама не разумеў, але што з тым зробіш.
Усё жыццё адбыў, як у лушпінах арэха,
І дарэмна хацеў быць кімсьці іншым.

А цяпер у зямлю, парафіяне.
З надзеяй, што трубы на Суд паклічуць нас па імёнах.
Замест вечнасці зелень і рух аблокаў,

Паўстаюць тысяча за тысячай Зосі, Кацярыны, Варфаламеі,
Марысі, Агаты, Браніславы,
Каб нарэшце ведалі,
Навошта тое было і для чаго.

МАЛІТВА

Пад дзевяноста маю, і яшчэ з надзеяй,
Што скажу, выкажуся, што набалела.

Як не перад людзьмі, то перад Табой,
Хто карміў мяне палыном і мёдам.

Саромлюся, бо мушу верыць, хто вёў і бараніў мяне,
Усё роўна як меў я перад Табой асаблівыя заслугі.

Быў я падобны да лагернікаў, якія дзве галінкі сасновыя
Вязалі крыжам, і шэптам маліліся ноччу ў бараку на нарах.

Прыносіў я да Цябе просьбы эгаіста, а Ты рачыў іх спаўняць,
А для таго, каб сам я ўбачыў, да чаго дурныя яны былі.

Але калі са шкадавання для іншых маліў пра цуд,
Маўчалі, як заўжды, што зямля, што Неба.

Маральна падозраны з прычыны веры ў Цябе,
Здзіўляўся я простадушнай упартасці няверуючых.

І што за танцор з мяне перад Вяліччам,
Калі маю рэлігію за добрую для слабых, як сам?

Найменш нармальны з усяго класа ксяндза Хомскага,
Ужо тады ўглядаўся ў шалеючы вір прызначэння.

Цяпер пяць маіх пачуццяў паволі замком замыкаеш,
І я толькі стары чалавек на канапе ў цемры.

Выданы таму, што мяне і так мучыла,
Бег я спераду самога сябе, вершыкі ўсё складаў.

Звольні мяне ад правінаў, выдуманых і сапраўдных,
Запэўні мяне, што рабіў я дзеля Твае хвалы.

А ў хвіліну мае агоніі будзь са мною Тваім цярпеннем,
Бо не можа яно ратаваць ад болю той свет.

DAEMONES

Споведзі час надыходзіць.
І адкрываецца праўда.
Жыцця тваяго стагоддзе
На свет ідзе, як з-за кратаў.
Горкае тое імгненне,
Голаву кожны апусціць,
Сорам баліць, сумленне,
Калі, як на сцэну, пусцяць
Да публікі абыякавай,
Што спіць на старой трагедыі.
Цаню я тваю адвагу,
І кладу на твой зыск, каб ведалі,
Што ты церпіш з вачыма адкрытымі,
Не хаваешся ў той іроніі.
А дарэчы, старому і збітаму,
Час глядзець на сябе, як старонняму,
Прайшлі гулянкі, раскошы,
Пакута, можа, паможа,
Ногі баляць, не спіцца,
І мяса труны баіцца.

Да канца дабягае дамова.
Не стрымаеш заходу сонца.
Адрабіў прамовы, замовы,
Недарэмна пражыў, час скончыць.
А твае выбраныя творы

Ліжа слава, як хваляй мора,
Тыя прэміі, гонар, авацыі
Ты прыймаеш у добрых манерах,
Залаты ланцуг маеш важны,
Што мацуе ў надзеі і веры.

— Шкада мне, паночкі д'яблы!
Каб вы хоць далі мне складна,
Але вам з мяне зыску мала,
Каб у душах у вас заспявала,
Бо заўжды мяне форма вязала,
А гульня ўжо йшла — і замала
Сам глядзеў я, ці лепшы, ці горшы,
Ці іначай як выглядаю,
Бо калі ў гульні пераможаш,
То жыццё далей выбягае.
Рытмы з рыфмамі проста здзьмухнуць
І адну квінтэсэнцыю чуць.

Абабег я кафедры змрочныя,
Абаронцы нябачныя крочылі
За мной следам — у попеле, дыме.
Але ўсе мы прыйшлі жывымі.
Быў караны, бо выжыў у замеці
Долі той, меў правалы ў памяці,
Надта ж чорныя вершы складаў.
Але кім я быў так папраўдзе,
Пісаніна ніколі не здрадзіць.
А, каб я ў аблоках лятаў,
Што, прапораце Неба віламі,
Каб да смерці шпыняць мяне вінамі,
Дзе ж я гэта калекаю стаў?

— Кепска быць, прызнаеш з пакорай,
Быць здаровым, бо маюць за хворага.
І штодзённую роспач хаваць,
Страшнай маскі з вачэй не змываць,
І з надзеяй па бруку цягнуцца,

Што больш людзі не засмяюцца.
А трывога мая найбольшая,
Што залезуць у душу, да болю
І замест Справядлівага
Прыдурка ўбачу вечна шчаслівага,
Каторы ў адным нязменны:
У сваім вялікім значэнні.
— Падсвядомасці ніякай не меў я.
Грахоў меў шмат, і душой, і целам.
З псіхааналізам да мяне не лезьце.
Калі нават прагрэс, то нічога па тым прагрэсе.
Проста д'яблы мучаюць, проста горка і крыўдна.
Баранюся замовай, як быццам малітвай.
А замест споведзі ноччу складаю строфы.
Толькі таму разумны, бо з засценка родам.

ПА ЎСІМ

Зляцелі з мяне погляды, перакананні, вераванні,
характарыстыкі, аксіёмы, прынцыпы,
звычкі і правілы.

Ачухаўся голы на ўскрайку цывілізацыі,
якая здалася мне камічнай і незразумелай.

Скляпенні залаў паезуіцкай акадэміі,
дзе калісь набіраўся навукі,
не былі б мною задаволеныя.

Хоць дагэтуль памятаю
колькі лацінскіх сентэнцый.
Далей цякла рака праз дубровы і сасновыя бары.
Стаяў у траве па пояс, дыхаў дзікім водарам
жоўтых кветак.

І аблокі. Як заўжды ў гэтым Краю,
поўнае Неба аблокаў.

ПРАМЕННІ ЯСНАСЦІ

Тут ясныя праменні,
Тут росаў зіхаценне.
Дапамагайце кожнаму,
Хто спазнае прыгожае.

Заслона недасяжная.
Сэнс спраў зямных нябачны.
Пакуль жывем, імчым у сне,
Шчаслівыя і не.

Мы ведаем, бег скончыцца.
Пагубленае знойдзецца.
І будзем мець, што мелі,
З душой у бедным целе.

MITTELBERGHEIM

Станіславу Вінцэнцу

Спіць віно ў бочках з дубоў над Рэйнам.
Будзіць мяне звон касцёла між вінаградаў.
Міттэльбергхайм. Чуў малую крыніцу,
што цурчыць на падворку ў цэбар,
стук драўляных ступакоў на вуліцы,
плугі, драўляныя колы, подых тытуню пад паветкай,
схілы гор — і восень побач са мною.

Мае вочы яшчэ спяць. Не падганяй Ты мяне,
Агонь, Моц, Сіла — зарана яшчэ.
Я пражыў шмат гадоў і, як у тым сне,
чуў, што дасягаю рухомай граніцы,
за якой праяўляюцца колер і гук,
за якой паяднанае ўсё на зямлі.
Не адчыняй маіх вуснаў гвалтам.
Дай мне верыць, што сам дасягну

і што сам даплыву ў Міттэльбергхайме.
Я ведаю — бо абавязаны. Са мною восень,
драўляныя колы, лісце тытуню пад паветкай,
тут навокал...

Тут мая зямля,
дзе б не глянуў і на якой не пачуў бы мове,
і я шчаслівей другіх, бо магу браць усё —
погляд, усмешку, зорку, складку шоўка на каленях.
Спакойна азіраючыся, маю ісці скрозь горы
на світанку дня — над вадой, над местам,
над дарогамі, над звычаямі людзей...
Агонь, Моц, Сіла, які мяне так трымаеш
у сваёй далоні, чые барозны глыбокія, што яры,
вычасаныя паўднёвым ветрам.
Агонь, Ты пэўнасць даеш у хвілінах жаху,
у тыднях сумневу —
зарана яшчэ, хай віно даспее.
Хай спадарожныя спачываюць у Міттэльбергхайме.

МАЛЫ ПЕРАПЫНАК

Жыццё не дзеля цярпення, але неяк цярпелі.
Чыё? Маё?! А што гэта значыць?

У малым перапынку, заядаючы шніцалем на паперцы,
стаю пад сцяной,
поўны задумы на тоўстых шчоках.

І быў бы сабе, кім не быў ніколі.
І дабіўся бы сабе, чаго не дабіўся.
Галак за вакном на снезе я ўспамінаў бы іншых,
не ў такіх маіх словах думаючы.
А калі скажуць, што чуў я адзін шум ракі
між Геркулесавых Слупоў,
то і даволі — бо замучыла мяне тая слуханіна.

У цёмных пакоях пісарчукі нешта лічаць,
бразгаюць на касцяшках.
Альбо — гоняць статкі з дымам пажараў.
Кінутае адзенне яшчэ хвіліну
трымае форму плячэй і рук.
На ружовае мядзведзяня насыпалася кастрыца.
А тут — новыя народы,
з мноствам сваіх вазоў і гарматаў.
Ну і што б рабіў у тым калючым канцлагеры?!

Калі б споўнілася ранняе каханне!
Калі б шчаслівы ішоў Партовай вуліцай
(не было там ніякага порта, адно мокрае бярвенне
ля тартака на беразе),
калі б сабе ехаў у дэлегацыі, залічаны да айцоў места,
а каб мы яшчэ падпісалі дамову з “Ферары”...

Хто хоць раз нараджаецца на Зямлі,
быць мог бы тым, каго ў сне
наведала б Ізіда,
мог бы спазнаць абрад таямнічы
і пазней казаць: бачыў.
Бачыў апоўначы сполахі ў праменнях.
Ступіў за парог Празерпіны.
Усё да дробязяў абабег і вярнуўся.
І багоў з-пад зямлі. І багоў з-над нябёсаў.
Абагаставіў іх — вачыма ў вочы.

Альбо — гладыятар, нявольнік.
Пад надпісам на камяні гладкім:
не было мяне.
быў.
няма мяне.
не стараюся ні пра што.

*Пераклаў з польскай — **Алесь Чобат***

КАРЭЛ ЧАПЭК
Karel Čapek

ЧАСЫ ЗАНЯПАДУ

Перад пячорай было ціха. Толькі развіднелася, як мужчыны пайшлі, махаючы дзідамі, у бок Бланска альбо да Райцаў, дзе быў заўважаны статак аленяў. Тым часам жанчыны збіралі ў лесе журавіны, часам было чуваць іхні віск і балбатню. Дзеці з большага плюхаліся ўнізе ў ручаі – ды і хто даглядаў бы гэтых гарэзаў, гэтую распярэзаную і здзічэлую галоту. А стары дагістарычны чалавек Яначак драмаў сярод гэтай прыемнай цішы на лагодным кастрычніцкім сонцы. Праўду сказаць, ён храпеў і ў носе ў яго свісцела. Але ён рабіў выгляд, што не спіць, бо як ніяк быў ахоўнікам пячоры племені і яе гаспадаром, як належыць старому правадыру.

Яначкава старая расклала свежаздзёртую скуру мядзведзя і пачала скрэбці яе вострым лёзам. Гэта трэба рабіць старанна, пядзю за пядзяй – А не так, як робіць маладуха, -- прыйшло ў галаву старой Яначкавай. Тая недарэка абы як пачухае, ды ўжо ляціць нянькацца ды кешкацца з дзецьмі. Такая скура, думае старая Яначкава, не вытрымае нічога, ссохнецца або сапрэе; але я не буду звязвацца з ёю, думае пра сябе пані Яначкава, пакуль ёй не скажа сын. – І што праўда, дык тое, што маладуха не ўмее эканоміць. Эх, гэты кажух прабіты якраз пасярод хрыбта! Людцы даражэнькія, наракае старая, што за небарака пхнуў таго мядзведзя

ў спіну? Папсаваў усю скуру! Мой так ні за што не зрабіў бы, ён заўсёды біў прама ў карак.

„Э-хэ-хэ", раптам завохкаў стары Яначак, праціраючы вочы. „Яшчэ не вярнуліся?"

„Дзе там", прабурчэла старая. „Не дачакаешся".

„М-да", уздыхнуў стары, сонна жмурачыся. „І дзе гэта яны? Ага. А дзе жанчыны?"

„А што мне, глядзець за імі?" забурчэла старая. „Ведаеш жа, недзе бадзяюцца".

„А-ха-ха", пазяхнуў дзед Яначак. „Недзе бадзяюцца. Замест... замест таго, каб, скажам, тое альбо тое... А так вось. Вось так!"

Было ціха. Толькі старая Яначкава хутка і са зласлівай стараннасцю скрэбла сырую скуру.

„Я і кажу", гукнуў стары Яначак, задуменна чухаючы спіну. „Убачыш, яны зусім нічога не прынясуць. І трэба ж дадумацца: я пра гэтыя іхнія нікчэмныя касцяныя дзіды. Я ўсё кажу сыну: Глядзі, любая костка недастаткова цвёрдая і надзейная, каб з яе рабіць дзіды! Нат ты, як жанчына, павінна прызнаць, што ані косць, ані алені рог не маюць гэта – гэткай прабіўной сілы, ведаеш? Трапіш гэтым вось у костку, а костка костку не праб'е, ці ж не так? Думаць жа трэба. А вось каменная дзіда, даражэнькая... Ведама, з ёю больш працы, але затое, даражэнькая, гэта ж прылада. Дык хіба сыну што скажаш?"

„Сам ведаеш", падхапіла з горыччу пані Яначкава. „Сёння ўжо нікім не пакамандуеш".

„Ды я нікім і не камандую", расхваляваўся дзядок. „Але ж не даюць сабе рады! Учора я знайшоў там пад скалой такі прыгожы плоскі абломак крэмня. Дастаткова было б крыху абчасаць яго, і быў бы то наканечнік дзіды ўсім на радасць. Нясу яго дахаты і паказваю сыну: Глядзі, вось гэта камень, га? а ён на гэта – і навошта ён, тата? – Дык яго ж, кажу, можна абсячы на дзіду. – Ды кіньце вы, татка, кажа ён, хто гэта будзе часаць ды поркацца? Без таго ўсякага ламачча ў пячоры цэлыя кучы, няма куды падзець; на дручку яно не трымаецца, як ты не прывязвай, дык што з ім рабіць? – Лентухі!" раптам пачаў крычаць дзед. „Сёння нікому ўжо не хочацца апрацаваць як след кавалак крэменя, вось як! Распярэзаліся! Вядома, такі касцяны наканечнік робіцца раз-два, але ж і зламаецца ў любы момант. І няхай сабе, кажа сын, зробім новы і ўсё тут. Ага, і да чаго яно дойдзе? Штохвіля новая дзіда! Сама скажы, дзе такое бачана? Мая ж ты жоначка, ды такі прыстойны крамянёвы наканечнік мог бы вытрымаць цэлыя гады! І я кажу, і будзе так, як я сказаў: яны яшчэ вернуцца з радасцю да нашай сапраўднай ка-

меннай зброі! Таму я і хаваю, дзе што знайду: старыя дзіды, сякеры і крамянёвыя нажы. А гэта ўсё ламачча!"

Старога правадыра душылі сум і раздражненне. „Ну, бачыш", азвалася пані Яначкава, каб навесці яго на іншыя думкі. „Тое самае са скурамі. Матуля, кажа мне маладуха, навошта столькі скрэбсці, шкада працы? Паспрабуйце хоць раз вырабіць скуру попелам, тады прынамсі не смярдзіць". – „Ты мяне яшчэ будзеш вучыць", абарвала старая адсутную нявестку, „я ведаю, як трэба! Спрадвеку людзі скуры скрэблі, і якія то былі скуры! Вядома, калі табе шкада працы... Ім абы адчапіцца ад працы! Таму яны ўвесь час нешта прыдумваюць і перайначваюць. Вырабляць скуру попелам! Дзе вы такое чулі!"

„Так вось цяпер," пазяхнуў Яначак. „Дзе ўжо там, так, як мы рабілі, ім ужо не пасуе. Маўляў, каменную зброю няёмка трымаць у руцэ. Гэта праўда, мы не надта зважалі на камфорт; але сёння – ані-ні, абы ручкі не назаляць! Сама скажы, да чаго гэта ўсё дойдзе? Вазьмі цяперашніх дзяцей. Толькі іх, дзядуля, не чапайце, кажа нявестка, няхай сабе гуляюць. Ага, і што з іх будзе?"

„Ну хаця б яны не рабілі такі гармідар," наракала старая. „Ім абы гарэзіць, праўду кажу!"

„Вось такое цяперака выхаванне," казаў стары Яначак. „А калі час ад часу скажу нешта сыну, дык ён кажа: Татуля, вы ўжо гэтага не разумееце, цяпер іншыя часы, іншая эпоха. Дык жа, кажа, і гэтая касцяная зброя не ёсць апошнім словам; некалі, кажа, людзі вынайдуць яшчэ іншы матэрыял. Ну, ведаеш, гэта ўжо занадта: нібыта нехта калі бачыў іншы трывалы матэрыял, акрамя каменя, дрэва або косці! Ты павінна прызнаць гэта, як дурная баба, што... што... што гэта перакрочвае ўсе межы!"

У пані Яначкавай апусціліся рукі. „Ты", сказала яна,"і скуль толькі бярэцца ў іх гэтая дурасць?"

„Ну, гэта ж цяпер такая мода," шамкаў бяззубым ротам старэча. „Вось, калі ласка, тамака ў той бок, чатыры дні хады адсюль, прыйшло нейкае новае племя, нейкая чужынская галота, гэта яны ўсё так робяць. Каб ты ведала, усёй гэтай дурасці нашы набраліся ад іх. Гэтай касцяной зброі і ўсяго. Нават... нават купляюць у іх гэта," крыкнуў ён засмучана. „За нашыя добрыя скуры! Нібыта ад чужынцаў некалі было якое дабро! Галоўнае абы не звязвацца з чужынскім збродам! Наогул, гэта стары досвед продкаў: на кожнага чужаніцу трэба без лішніх размоваў напасці ды цюкнуць. Так было спрадвек: нюні не распускаць, а даць яму дыхту. Ды што вы, тата, кажа сын, цяпер іншыя справы, цяпер у нас абмен таварамі... Абмен таварамі! Калі некага пабіць і адабраць у яго ўсё, што меў, то тавары нашы, а таму не трэба нічога за гэта даваць... навошта нейкі абмен? Ды

што вы, тата, кажа сын, пры гэтым вы расплочваецеся чалавечымі жыццямі, а іх шкада!.. Вось як: шкада, маўляў, чалавечых жыццяў! Такія вось цяперашнія погляды," балматаў з агідай стары. „Яны баязліўцы, справа ў гэтым. Шкада, маўляў, жыццяў! А як, скажы, пракарміць столькі людзей, калі яны не будуць забіваць адзін аднаго? Ужо і цяпер у гушчы засталося зусім мала аленяў! Глянь ты, чалавечых жыццяў ім шкада; але да традыцыі павагі не маюць, сваіх продкаў і бацькоў не шануюць... Гэта ж нейкі заняпад," гукнуў дзед Яначак. „Днямі гляджу, а нейкі смаркач мазюкае глінай па сцяне пячоры фігуру бізона. Я яму даў у карак, а сын кажа: Не чапайце яго, бізон жа атрымаўся, як жывы!.. Ну такога яшчэ не было! Хіба раней займаліся такімі празмернасцямі? Як не маеш што рабіць, хлопча, дык чашы нейкае лязо, толькі не малюй бізонаў на сцяне! Навошта нам уся гэта лухта?"

Пані Яначкава сціснула вусны: „Калі б толькі бізоны," вымавіла яна праз хвіліну.

„Што там яшчэ?" спытаўся дзед.

„Так, нічога," замялася пані Яначкава, „мяне сорамна пра гэта казаць... Так, каб ты ведаў," раптам яна набралася смеласці, „сёння раніцай я знайшла... У пячоры... кавалак мамантавага біўня. З яго была выразана... нібыта голая жанчына. Грудзі і ўсё такое, ведаеш?"

„Ды ты што," жахнуўся старэча. „І хто ж гэта выразаў".

Пані Яначкава расчулена пацінула плячыма: „Хто ж яго ведае? Мабыць нехта з маладых. Я гэта кінула ў агонь, але... У той былі такія грудзі! Ого!"

„... Ну, далей няма куды," вырвалася ў дзеда Яначка. „Дык гэта ж распуста! Бачыш, а ўсё ад таго, што яны рэжуць усё магчымае з косці! Нам такая бессаромнасць за ўсё жыццё ў галаву не прыйшла, таму што з крэменя такое не зробіш... Вось да чаго гэта давяло! Вось яны, іхнія вынаходніцтвы! Яны ўвесь час будуць нешта выдумляць, будуць нешта новае ўводзіць, аж покуль усё не раструшчаць ды не панішчаць... І я кажу," гукнуў дагістарычны чалавек Яначак у прароцкім прасвятленні, „што гэта не на доўга!"

/1931/

СВЯТАЯ НОЧ

„Ты мяне здзіўляеш," крычала пані Дзіна. „Калі б то былі прыстойныя людзі, то пайшлі б да старасты, а не сталі б жабраваць! Чаму іх не пусцілі ў дом Шымановічы? Чаму гэта менавіта мы павінны даваць ім прытулак? Што мы, нечым

горшыя ад Шымановічаў? Я ведаю, Шымонава жонка такую галоту не пусціла б у хату! Здзіўляеш ты мяне, чалавеча, што так апускаешся перад невядома кім!"

„Не крычы," бурчэў стары Ісахар, „а то яны пачуюць!"

„Няхай чуюць," не ўгаманялася пані Дзіна, яшчэ больш падвышаючы голас. „Небачаныя рэчы! Дык што гэта за гульні такія, што я не смею пікнуць ва ўласнай хаце з-за нейкіх бадзяг! Ты ведаеш іх? А можа хто іншы іх ведае? Ён кажа, гэта мая жонка. Кажуць, ягоная жонка! Ведаю я, якая завядзёнка ў такіх туляг! А табе і не сорамна пускаць нейкіх такіх у хату!"

Ісахар хацеў быў запярэчыць, што пусціў іх толькі ў хлеў, але не стаў; бо надта любіў свой спакой.

„А яна," працягвала раз'юшана пані Дзіна, „яна ў цікавым становішчы, каб ты ведаў. На Пана Хрыста, яшчэ гэтага нам не хапала! Езус Марыя, да чаго мы дакаціліся! І дзе толькі была твая галава?" Пані Дзіна перавяла дух. „Ну, зразумела, нейкай маладзіцы ты не можаш сказаць: не. Як яна вытаропілася на цябе, дык ты і рады са скуры вылузацца, каб прыслужыць. *Дзеля мяне* ты б так не стараўся, Ісахар! Дык кладзіцеся, людцы, у хляве саломы хапае... Нібыта ва ўсім Віфлееме адны мы з нашым хляўком! Чаму гэта Шымановічы не далі ім ахапак саломы! Таму што Шымонка паказала б мужу, як ёй гэта не падабаецца, разумееш? Адна я, дура не дура, толькі такая натура, маўчу..."

Стары Ісахар павярнуўся да сцяны. Можа перастане, думаў ён; яна крыху мае рацыю, але падымаць такі вэрхал...

„Пускаць чужых людзей у хату," надрывалася ў справядлівым гневе пані Дзіна. „Хто ведае, што яны за такія? І цяпер мяне цэлую ноч са страху не зажмурыць вока! Але ж табе ўсё адно, як бачу? Дзеля людзей ты ўсё, а дзеля мяне нічога! Хаця б раз ты палічыўся са сваёй змардаванай і хваравітай жонкай! А раніцай мне яшчэ прыбіраць за імі! Калі гэты чалавек цясляр, чаму ён не на працы? І чаму гэта я павінна цярпець гэтыя прыніжэнні? Чуеш, Ісахар?"

Але Ісахар, павярнуўшыся да сцяны, рабіў выгляд, што спіць.

„Дзева Марыя," уздыхала пані Дзіна, „такое вось жыццё! Не спаць ад хвалявання цэлую ноч... А ён сабе спіць, як бервяно! Нам павыносяць усё з хаты, а ён сабе дрымне... Божа, што за напасць!"

Каля поўначы яго абудзіў з дрымоты здушаны жаночы стогн. Вой, бяда, – напалохаўся гаспадар, – ну, цяпер трымайся! Абы не раззлавалася Дзіна... Тады яе не ўціхамірыць!

І ляжаў нерухома, нібыта спаў.

Праз хвіліну пачуўся новы стогн. Божа, змілуйся! Божа, зрабі, каб Дзіна не

абудзілася, маліўся напалоханы стары Ісахар, але ўжо пачуў, як Дзіна пад ягоным бокам закруцілася, потым устала і пачала напружана ўслухоўвацца. Бяды не пазбегнуць, сказаў сабе ў адчаі Ісахар і затаіўся.

Пані Дзіна моўчкі ўстала, накінула ваўняную хусту І выйшла на двор. Няхай ідзе, сказаў сабе бязрадны Ісахар. Я лезці ў гэта не буду, няхай робіць, што хоча...

Глухое маўчанне цягнулася дзіўна доўга. Потым пані Дзіна вярнулася, асцярожна тупаючы. Скрозь сон Ісахару падалося, што скрыпяць і грукаюць нейкія дзверы, але ён вырашыў не высоўвацца. Мабыць, Дзіне холадна, падумаў ён, і яна распальвае агонь.

А Дзіна тым часам ізноў ціхенька выйшла. Ісахар расплюшчыў вочы і ўбачыў над вогнішчам кацялок з вадою. Навошта гэта, сказаў ён сам сабе здзіўлена і адразу ж заснуў. Абудзіўся ўжо тады, калі пані Дзіна нейкімі незвычайна імпэтнымі і рашучымі крокамі бегла на двор з кацялком, з якога валіла пара.

Ісахар здзівіўся, устаў і сяк-так апрануўся. Трэба паглядзець, што там, сказаў ён сабе энергічна, але ў дзвярах сутыкнуўся з Дзінай.

Даражэнькая, чаго ты так лётаеш, хацеў ён гукнуць, але не паспеў.

„Што ты тут соўкаешся?" гыркнула на яго пані Дзіна і пабегла на двор з нейкімі шматамі і полкамі ў руках. На парозе яна абярнулася. „Ідзі спаць", строга прыкрыкнула на яго, „... і не лезь не ў сваю справу, чуеш?"

Стары Ісахар выбраўся на дворык. Перад хляўком ён убачыў бязрадную мужчынскую постаць і падаўся да яе. „Вой-вой", прабурчэў ён жаласна. „Яна і цябе вытурыла? Ну, бачыш, Іосіф, гэта ж жанчыны..." І каб неяк не згадваць пра іхняе мужчынскае бяспраўе, гукнуў, паказваючы на неба: „Глядзі, зорка! Ці ты бачыў калі-небудзь такую зорку?"

/1930/

АЦІЛА

Раніцай гончык прынёс з узлесся паведамленне, што на паўднёвым усходзе ўначы палае вогненная паланіца. У той дзень было холадна і вільготна, падаў дробны дожджык, мокрыя дровы не хацелі гарэць; трое людзей з групы, што хавалася ў яры, памерлі ад крываўкі. Не было што есці, і тады двое мужчын выправіліся да пастухоў ў залессе. Яны вярнуліся позна пасля абеду, прамоклыя і выматаныя на смерць. Ад іх ледзь дамагліся расповеду пра кепскія справы: авечкі здыхаюць ды і каровы пухнуць; пастухі кінуліся на іх з каламі і нажамі,

калі адзін з іх хацеў адвесці ўласную цялушку, якую быў даверыў ім перад уцёкамі ў лес.

„Памолімся", сказаў святар, які пакутваў на дызентэрыю. „Госпад змілуецца".

„Хрыстэ элейсон", пачаў у роспачы мармытаць невялікі натоўп. У гэты момант выбухнула вісклівая сварка паміж жанчынамі з-за нейкай ваўнянай шматы.

„Што гэта такое, праклятыя бабы?" зароў стараста і пачаў хвастаць жанчын пугай. Гэтым бязраднае напружанне неяк паслабілася, мужчыны зноў адчулі сябе мужчынамі.

„Сюды гэтыя чуркі на конях не дабяруцца," разважаў адзін вусач. „Слабкавата ім па гэтых ярах ды пралесках... У іх жа коні малыя ды худасочныя, як козы".

„Я вось скажу", запярэчыў нейкі раздражнёны мужык, „што трэба было нам заставацца ў горадзе. Столькі мы грошай аддалі на гэтыя муры... За такія грошыкі можна было паставіць муры да самага неба, ці ж не так?"

„Ну, ведаеш", пасмейваўся сухотлівы пісар. „За такія грошыкі можна было паставіць муры з кнышоў. Хадзі ды адкусі кавалак – шмат людзей пажывілася з гэтага; можа і табе што засталося".

Стараста пагрозліва засоп; размова яму відавочна не падабалася.

„А я скажу", гнуў сваё раздражнёны грамадзянін, „што кавалерыя нішто супраць такіх муроў... Не пускаць іх у горад ды ўсё тут. Сядзелі б цяпер У сухім".

„Дык вяртайся ў горад ды залазь у ложак," параіў яму вусач.

„Што мне там рабіць самому?" запярэчыў раздражнёны. „Я толькі кажу, што трэба было нам заставацца ў горадзе і бараніцца... Я ж маю права сказаць, што дапушчана памылка, не? Тыя муры столькі нам каштавалі, а тут раптам кажуць, што яны ні на што не вартыя! Так атрымліваецца, даражэнькія!"

„Няхай будзе так ці не так," працягваў святар,"а мы мусім спадзявацца на дапамогу божую. Людцы, гэты ж Аціла ўсяго толькі нейкі паганец..."

„Біч божы", азваўся манах, трасучыся ад ліхаманкі. „Кара божая".

Мужчыны пахмурна змаўчалі; хворы на ліхаманку манах увесь час чытаў ім маралі, хаця і не належаў да супольнасці. У нас ёсць свой святар – думалі мужчыны.—Ён наш, трымаецца разам з намі і не папракае надта за нашыя грахі. Нібыта ўжо мы столькі награшылі, думалі пра сябе незадаволеныя мужчыны.

Дождж скончыўся, але цяжкія кроплі ўсё яшчэ шамацелі, падаючы з кронаў дрэў. Божа, божа, божа, дундзеў святар, пакутуючы ад хваробы.

Надвячоркам вартаўнікі прыцягнулі мізэрнага юнака, уцекача з захопленай ворагам тэрыторыі на ўсходзе.

Стараста надзьмуўся і пачаў дапытваць юнака. Ён відавочна прытрымліваў-

ся думкі, што такую дзяржаўную справу трэба рабіць заўзята. Так, сказаў юнак, гуны ўжо ў адзінаццаці мілях адсюль і паціху прасоўваюцца далей; яны занялі ягоны горад, ён іх бачыў. Не, Ацілу не бачыў... аднак, бачыў іншага генерала, такога тоўстага. Дык горад спалілі? Не, не спалілі; той генерал выдаў пракламацыю, што цывільнаму насельніцтву нічога не будзе, але горад павінен даць войску пітво, правіянт і яшчэ нешта. А таксама, што грамадзяне павінны паўстрымацца ад любых непрыяцельскіх выказванняў супраць гунаў, а інакш дойдзе да суровых рэпрэсій.

„Але ж тыя паганцы забіваюць і жанчын і дзяцей," заявіў з упэўненасцю вусач.

Здаецца, што не, сказаў юнак. У іхнім горадзе прынамсці не. Ён сам быў схаваўся ў салому, але калі матулька сказала, маўляў, людзі кажуць, што гуны будуць забіраць маладых мужчын пасвіць іхнія статкі, то ён уцёк уначы. Вось, маўляў, і ўсё, што ведае.

Мужчыны расхваляваліся. „Дык жа вядома," заявіў адзін, „што яны адсякаюць немаўляткам рукі, а ўжо што робяць з жанчынамі, дык і не выказаць".

„Я нічога такога не ведаю," сказаў юнак, нібыта апраўдваючыся. Прынамсці, калі яны прыйшлі, дык так кепска не было. А колькі ёсць тых гунаў? Можа з дзвесце, больш не будзе.

„Хлусіш," крыкнуў вусач. „Кожны ведае, што іх больш за пяць тысяч. І куды яны прыходзяць, там усіх забіваюць і ўсё паляць".

„Зачыняюць людзей у гумно і паляць там," сказаў другі.

„А дзяцей саджаюць на дзіды," падхапіў трэці з прыкрасцю.

„І пякуць іх на агні," дадаў чацьверты, шморгаючы носам. „Праклятыя паганцы!"

„Божа, божа," стагнаў святар. „Божа, змілуйся над намі".

„Ты падаешся мне нейкім дзіўным," звярнуўся вусач да юнака з падозраю. „Як ты можаш казаць, што бачыў гунаў, калі ты хаваўся ў саломе?"

„Матулька іх бачыла," балматаў юнак, „і насіла мне на паддашак ежу..."

„Хлусіш," гарланіў вусач. „Мы ж ведаем, што куды б гуны не прыйшлі, зжыраюць усё, як саранча. Пасля іх нат лісця на дрэвах не застаецца, ясна?"

„Цару нябесны, цару нябесны," пачаў істэрычна галасіць раздражнёны грамадзянін. „А чаму гэта ўсё так? Хто вінаваты? Хто дапусціў? Мы столькі грошай аддалі на войска... Цару нябесны!"

„Хто дапусціў?" здзекліва азваўся пісар. „А то ты не ведаеш? Спытайся візантыйскага пана імператара, хто паклікаў сюды гэтых жоўтых малпаў! Хлопча, сёння ўжо кожны ведае, хто аплочвае перасяленне народаў! Гэта называецца – высокая палітыка, ведаеш?"

Стараста з важнасцю засоп. „Глупства. Усё зусім інакш. Яны, гэтыя гуны, мабыць, дома пухлі з голаду... навалач гэткая... працаваць не ўмеюць... ніякай цывілізацыі... а жэрці хочуць. Таму і ідуць на нас... каб нам гэта... плён нашай працы. Ім бы толькі красці, дзяліць здабычу... І перці далей, падлюгам!"

„Гэта неадукаваныя паганцы," сказаў святар. „Дзікі і неасвечаны народ. Гэта Госпад проста нас выпрабоўвае; памолімся і падзячым, і ўсё неяк будзе добра".

„Біч божы," пачаў усхвалявана прамаўляць ахоплены ліхаманкай манах. „Бог вас карае за вашы грахі, Бог вядзе гунаў і знішчыць вас, як некалі Садома. За вашую распусту і блюзнерства, за упартасць і бязбожнасць вашых сэрцаў, за вашую сквапнасць і абжорлівасць, за вашу грэшную раскошу і мамону вас Бог пакінуў і выдаў у рукі ворагаў!"

Стараста пагрозліва прахрыпеў: „Ты асабліва не раззяўляйся, Domine: тут табе не касцёл, ведаеш? Яны прыйшлі, каб нажэрціся. Яны – згаладнелыя, абадранцы і галота..."

„Гэта ёсць палітыка," заўпарціўся пісар. „Адчуваецца рука Візантыі".

Але тут рэзка азваўся чарнявы мужык, па прафесіі лудзільшчык: „Ніякай Візантыі; гэта ўсё катляры нарабілі, больш няма каму! Тры гады таму тут быў вандроўны катляр, дык ён меў такога малога і сухарлявага каня, як у гунаў".

„Ну і што з таго?" спытаўся стараста.

„Раскіньце мазгамі," крычаў чарнявы мужык. „Гэтыя катляры ішлі наперадзе ды глядзелі, што дзе... То былі шпіёны... Гэта змова катляроў! Ці хто ведае, адкуль яны прыйшлі? і што наогул ім тут было трэба? Што, што... навошта, калі ў горадзе ёсць свой лудзільшчык? Абы толькі нам справу папсаваць... ды шпіёніць... Хаця б раз пайшлі ў касцёл... чаравалі... быдла закліналі... курваў за сабой цягалі. Усё ад гэтых катляроў!"

„Нешта ў гэтым ёсць," падхапіў вусач. „Катляры народ дзіўны, нат сырое мяса жаруць".

„Кодла злодзеяў," пацвердзіў стараста. „Курэй крадуць і наогул."

Лудзільшчыка душыў справядлівы гнеў. „Дык бачыце! Кажуць: Аціла, а на самой справе катляры... За ўсім, за ўсім гэтыя праклятыя катляры! Зачаравалі нам быдла... наслалі на нас панос... Усё катляры! Трэба было іх вешаць, як толькі які з'явіцца! Вы што, не ведаеце... не ведаеце пра пякельныя катлы? А можа не чулі, што гэтыя гуны на маршы грукаюць у катлы? І дзіця павінна зразумець гэтую сувязь! Гэта катляры ва ўсім вінаватыя... А ты," крычаў ён з пенай на вуснах, паказваючы на чужога юнака, „ты таксама катляр, ты – хаўруснік і шпіён катляроў! Таму прыйшоў сюды... І хочаш нам галаву задурыць, як гэтыя катляры, ты хацеў нас здрадзіць катлярам..."

„Павесіць яго”, завішчаў узбуджаны мужык.

„Пачакайце, суседзі,” гарланіў стараста сярод агульнага вэрхалу. „Гэта трэба расследваць... Ціха!”

„Што з ім цырымоніцца,” скавытаў нехта.

Пачалі збягацца жанчыны.

У тую ноч успыхнула паланіца і на паўночным захадзе. Падаў дробны дождж. Пяцёра чалавек з групы памерлі ад крываўкі і кашлю.

Юнака павесілі пасля доўгіх катаванняў.

/1932/

Пераклаў з чэшскай Валеры Буйвал

Karel Čapek. Kniha apokrifů. Praha, 1974. (Заўвага перакладчыка. У тэксце пакінута (нетыповая) пунктуацыя чэшскага арыгіналу – В.Б.)

Карэл Чапэк *(1890-1938) – чэшскі пісьменнік і драматург. У беларускім перакладзе друкуюцца тры навелы з ягонай „Кнігі апокрыфаў”.*

ПЭР ЛАГЕРКВІСТ
Pär Lagerkvist

ВЫЗВАЛЕННЕ

Я сяджу і трымаю маленькі камень у руцэ. Ён чырвоны з сінімі пражылкамі. Калі прыглядацца, то ён мае яшчэ шмат колераў: зялёны, фіялетавы, і яшчэ нешта ззяе, як золата. Калі павольна паварочваеш яго, то мяняюцца ўсе колеры і нюансы, нібыта ўсе яны знаходзяцца ў ім. Я ніколі не стамляюся глядзець на яго, узірацца ў ягоную гладкую, чыстую паверхню, што здаецца амаль мяккай, як любая сапраўды гладкая паверхня. Дзіўна, што маленькі камень, – не больш за птушынае яйка, – можа даваць такія багатыя і невычэрпныя перажыванні, можа змяшчаць у сабе так шмат. Як цэлы свет. Нешта бясконцае, чаго часцінкай з'яўляешся ты. Ты сядзіш і так проста трымаеш гэта ў руцэ.

Я знайшоў яго на двары турмы і здолеў пранесці з сабой.

Падчас паўгадзіннага шпацыру забаронена нахіляцца і падымаць што-небудзь з зямлі. Ахоўнік убачыў і спытаў мяне, за чым гэта я нахіляўся. Але, калі я сказаў, што там нічога не было, ён адстаў ад мяне, сказаўшы толькі, што тут сапраўды няма што шукаць. Мне пашэнціла, ён не абшукаў мяне. Камень мой! У мяне сапраўдны камень! Свет, таямнічае, вялікае царства належыць мне. Царства без межаў, нешта невычэрпнае. Яно ўсё маё! Гэтае ўсё ёсць маёй уласнасцю. Усё гэта невядомае, жывое, сапраўднае, што напаўняе мяне сваёю бясконцасцю.

Трэба схаваць яго падалей, у кут пад нары. Там ніхто яго не знойдзе. Ды і хто будзе шукаць гэта?

Часта я думаю, што ўсё створана радасцю. Нябёсы, светы, сусвет, усё, што існуе. Хто яшчэ мог стварыць усе гэтыя прасторы, гэтую сонечную сістэму і Млечны Шлях, як не радасць. Чаму ж цяпер усё інакш? Чаму не так, як раніцай стварэння? Калі нябёсы і зямля тыя ж самыя, а жыццё такое ж багатае і захапляючае, нават яшчэ багацей, чым калісьці.

Што пазбавіла нас Радасці?

Сінь мае сваё значэнне, чырвань сваё. Усё ў камені мае, безумоўна, сваё значэнне. Я не магу ўсведаміць гэта, але разумею, што ўсё павінна быць напоўненае зместам, сэнсам і багаццем. Гэта ж відавочна. І калі гэта было так, то была і вялікая радасць. Чаму ж цяпер не так? Калі яна паўсюль і дастаткова толькі нахіліцца, каб завалодаць ёю. Яна зіхаціць паўсюль.

І на турэмным двары таксама.

Нябёсы і зямля твае. Зямля поўная кветак, і ўсе зоркі ззяюць. Але далёка, у пустыннай прасторы, не для цябе. А водар кветак нібыта створаны толькі для ветру.

Дык дзе той, хто павінен ўдыхваць водары і прымаць прывітанні з зоркі ў сузор'і Андрамеды? Ён, якога ранішняе сонца павінна шукаць першым сярод усяго жывога. Ён, што павінен блукаць па палях, аблашчаны святлом.

Дзе чалавек? Дзе ты?

Багацце жыцця ляжыць, нібыта забытае. Мы топчамся па беднай яго глебе, галеча напаўняе нас. Мы трымаемся за галечу, як ненавіснік за сваю нянавісць, як хворы за сваю хваробу. Жабракі, мы ямо гэты чэрствы хлеб, праклінаючы таго, хто ёсць побач з намі.

А багаты стол стаіць некрануты, гасцей няма.

Я не магу не разважаць над сваім лёсам. Над сваім і ўсіх іншых. Чаму мы сядзім тут за кратамі? І ахоўнікі таксама за кратамі турмы, іхняе жыццё праходзіць таксама, як наша. Значыць, калі тут утрымліваюцца вязні, то і ахоўнікі таксама становяцца вязнямі. Куды ні глянь – адны вязні. Каморы і вязні. Волі няма нікому!

Турэмным ахоўнікам павінна быць значна цяжэй. Іхняе жыццё павінна быць абсалютна пустым. Іхнія твары заўсёды пахмурныя і без выразу, нязменныя. а ў вязняў на тварах пакута, адчай, жарсці, яны поўныя жыцця, выразныя. Мы жывем у страху, увесь час нас нешта мучыць. Для нас галеча яшчэ мае свой сэнс.

Толькі вязні могуць знайсці нешта на турэмным двары.

Мора вызначыла ягоныя формы. Гэта ясна, менавіта таму ён такі гладкі. Мора насіла яго бясконцы час, магчыма цэлыя тысячагоддзі. Хвалі абмывалі яго, пры-

бой уздымаў яго і апускаў зноў, ён належаў бясконцай і нястомнай стыхіі. Аж покуль ён не стаў настолькі роўным, што здаецца мяккім, як жывая істота. Мяккі, як жанчына. Таму што яго вынасіла мора. Ён ляжаў ў глыбі і слухаў шум тысячагоддзяў, шамаценне пяску паміж камянямі.

Мора...

Я павінен быў любіць жыццё. Калі я ўспамінаю яго, то гэта нібыта ўспамін пра каханую жанчыну, з якой разлучаны даўно і назаўсёды. Бачыш ейныя залітыя сонцам валасы, але не можаш бачыць само сонечнае святло. А ейная постаць нібыта ідзе на фоне краявіду, які ўсё ніяк не паўстае ў памяці. Сцяжыну я не пазнаю, хаця ўпэўнены, што яна нейкім чынам знаёмая мне. Не пазнаю дрэва, менавіта гэтае дрэва. Але я бачыў дрэва, падобнае на гэтае. Шмат што забылася або проста змянілася з тае пары. Але не яна. Яна ўсё тая ж. Ейныя крокі лёгкія і павольныя, а галава крыху пахілена ў бок, нібыта перад нябачнай галінай. А можа яна ўслухоўваецца ў нешта. Так, гэта яна, я кахаў яе. Я не магу ўбачыць ейны твар. Таму што яна адыходзіць. Я бачу толькі постаць. А яна не абарочваецца.

Можа жыццё ўжо не мае для мяне твару?

Мора...

Яно ўздымаецца вечна, як і ўчора, як здавён-даўна, у недасягальнай даўніне. Хвалі плёскаюцца і шумяць. Мне здаецца, я чую іх, калі сяджу з каменем у руцэ. Я чую водгук хваляў, што набягаюць на бераг і зноў адступаюць.

З морам тое ж самае. Яго немагчыма забыць. Яно надта простае і вялікае, каб можна было забыць яго. У ім ёсць нешта цэльнае і нязменнае, нешта сталае, вечнае. Кожны яго рух вечны і заўсёды новы; набліжэнне хвалі да берагу, плынь, што мяняе накірунак, нібыта сустрэўшы нябачную перашкоду, і вось яна адступае, імкнецца да невядомай мэты. Мяккі ўздрыг на ягонай паверхні, нібыта подых глыбіні. Усё вечнае і вечна маладое.

Так, варта было кахаць яе.

Муры не могуць адгарадзіць мяне ад жыцця, ува мне шум мора. Яны здольныя толькі зрабіць так, што я не бачу ёйны твар. Глыбіня ўнутры нас, толькі цяпер у ёй нішто не адлюстроўваецца. Яны не могуць адгарадзіць нас ад кахання, а толькі разлучыць з каханымі. Але што яны зробяць, калі мы ўсё роўна кахаем?

У нейкі момант сасуды нашай існасці злучаюцца з усеагульнай глыбінёй. Тады ўсё становіцца цэласным, усё ўздымаецца і апускаецца разам з хвалямі, з вечным подыхам. Тады ўсё – гэта толькі глыбіня і нязменнасць, недасягальная і схаваная, непазнавальная. Што ёсць адлюстраваннем самой Рэчаіснасці? Што ёсць тварам жыцця?

Мабыць, я адчуваю нешта, што не адчуваў раней. Мабыць, разумею нешта важнае. Цяпер, калі валодаю гэтым нябачным, я разумею лепш. Гэта тое ж самае, калі думаецца лепш, закрыўшы вочы рукой. Мабыць, я напаўняюся, як начынне, таямнічай плынню і з заплюшчанымі вачыма пазнаю закрыты ад рэчаіснасці свет.

Нехта казаў пра сляпца, што перамог свой лёс. Чаму ж і мне не перамагчы?

Некаторыя думаюць, што можна бачыць у цемры. Не ведаю. Можа і не? Можа гэта свецяцца крыніцы, можа свеціцца глыбіня. А можа ўсё ўгрунтавана на радасці! Можа гэта – як узірацца ў вялікую, светлую раніцу стварэння.

Не, я не хачу прызнаць, што жыву ў галечы! Хачу верыць, што жыццё—гэта цуд, цуд вечнай маладосці. Хачу верыць, што ўнутры яго ёсць святло і што крыніцы майго жыцця праб'юцца праз усе муры. Хачу верыць, што ўсё добрае поўнае багацця і моцы, а дрэннае пераможана дабром. Я буду прыціскаць руку да вачэй і глядзець толькі ў сапраўдны і вечны свет маладосці.

Перамажы свой лёс! Адсунь муры, што засцілі нам далягляд! Яны думаюць, што здольныя ўвязніць нас, што могуць пазбавіць нас зроку. Не так проста пазбавіць чалавека зроку! Забяры ягоны свет – але гэта толькі адлюстраванне. Забяры ягонае жыццё – але гэта толькі яго ўласнае жыццё, а не тое, вялікае і ўсемагутнае, якому ён належыць і з якім яго не ўдасца разлучыць. Жыццё не ведае, што яны пабудавалі нейкія муры, закрылі крыніцы, каб нішто не адлюстроўвалася ў іх. Яно адкрывае крыніцы на турэмным двары і хавае іх, каб яны напоўніліся, а вязні спатолілі смагу. Яно адкрывае іх сляпцу, не ведаючы, што ён сляпы, не ведаючы болю і непакою. Яго нішто не хвалюе, яно недасягальнае, недаступнае нікому, ніхто не можа нанесці яму шкоду. Яно светлае і ўсемагутнае, якім было заўжды.

Людзі пакутуюць. Але жыццё не ведае пакутаў.

На тэрыторыі турмы расла вішня. Яе спілавалі. Але яна яшчэ красуе. Яна ляжыць на зямлі распілаванымі кавалкамі і красуе. Галіны скалечаны, але яны жывуць, і некаторыя з іх белыя ад квету. Здаецца, дрэва красуе, як звычайна, як заўсёды.

Не, вязні не павінны знемагаць у пакутах! Трэба пераадолець пакуты, пераадолець саму смерць. Яны належаць жыццю і іх нельга разлучыць з ім. Яно моцна трымае іх, яно не аддасць іх. Не дапаможа гвалт, не ўдасца зламаць, знішчыць іх. Яны поўныя нечага, што ніколі не паддаецца адчаю. А хто не адчайваецца, не ведае, што такое адчай.

Квітнее цела.

Так, мы былі целам. Але не на яго яны рабілі замах. Яны знявечылі чалавечае

цела, але ім не перамагчы. А ўрэшце бессмяротнае ў чалавеку – яно пераможа ўсе сілы знішчэння. Калі чалавек церпіць гвалт над сабой, у ім, у ягоным спакутваным целе ўсё ясней абуджаецца галоўная думка. Яе таямнічасць адкрываецца, як ніколі раней. І тады ўсё, што захінала глыбокі сэнс, знікае. Ад бясконцай пакуты вобраз згортваецца і набывае кранальную прастату і веліч. Самі сілы знішчэння і ўявіць сябе не могуць, што яны вызваляюць несмяротнае.

Але навошта тады ўсе гэтыя пакуты? Яны патрэбны для перамогі, нельга перамагчы без іх? Можа цела павінна застацца для нас назаўсёды знакам перамогі? Ці ёсць у гэтым сэнс? А пакута – гэта адзіны шлях нашага самаздзяйснення, самараскрыцця? Толькі праз яе мы існуем у глыбокім сэнсе? Ці гэта магчыма? Дык тады гэтыя сілы, што знішчаюць і нявечаць, -- стваральныя? Самі па сабе бясплённыя, няздольныя да жыцця, адмоўныя – але стваральныя. Стваральныя! І можа таму, з-за гэтай ўражальнай сувязі ім застаецца толькі наша цела.

Не, нішто не прымусіць мяне паверыць у гэта! Нішто не прымусіць паверыць!

Пакута нічога не стварае, яна ніколі не перамагае! А гвалт яшчэ менш здольны перамагаць. Яны не даюць нам самаздзяйснення! Такое ні ў якім сэнсе не можа быць стваральным. А толькі багацце, святло! Толькі яны трымаюць у сваёй руцэ стваральную сілу, толькі ў іх ёсць сцвярджэнне, здзяйсненне, станаўленне. Дык ці радасць не ёсць асновай жыцця!

Так, безумоўна. Я і не думаю інакш. Так мусіць быць.

Я адно не разумею, чаму пакута такая вялікая і, як злавесны цень, яна шырыцца і пакрывае сабой усё жыццё. Што ёй дазволена гэта. І чаму пакута ўсё мацней, цень яшчэ больш змрочны ў найвышэйшых формах жыцця, нібыта яна расце, становіцца ўсё больш інтэнсіўнай разам з інтэнсіўнасцю жыцця. Чаму гэта так? Можа гэта патаемная неабходнасць?

Так, як чалавек, не пакутуе ніводнае іншае стварэнне. І ўсё ж – як ніхто з іншых мы адораны багаццем і шчасцем, якое наканавана менавіта нам. Але цяжар нашага лёсу, ценю, што ляжыць на нас, цісне ўсё мацней і мацней. І нам ўсё цяжэй і цяжэй ісці па шляху да вышыняў.

Чаму чалавечы лёс – гэта сумны спектакль? Трагедыя ў раскошным каралеўскім замку, што ззяе ў святле дня, а ўначы жыве ў атачэнні вечных зорак. Старадаўняя захапляючая сага несмяротнай красы, але змрочная і прыніжальная для нас.

Дык у гэтым наша несмяротнасць?

Мы пытаемся. Мы абвінавачваем.

Але чалавек павінен змагацца. Працягваць змаганне за перадавыя пазіцыі, не

пакідаць сваё месца ў першай траншэі. Краіна без межаў належыць яму. Краіна, што рассцілаецца перад ім ўсё шырэй і шырэй на нічыёй зямлі – гэта наша радзіма, за якую мы змагаемся да перамогі і паміраем. Часам вораг прарывае пазіцыі, усё бяжыць у бязладдзі. Знясіленыя войскі прыхапкам збіраюць на новай лініі абароны далёка ззаду. Усе ў адчаі, жаўнеры ляжаць у сваіх лёхах смяротна стомленыя і змардаваныя, праклінаюць сваю краіну, якую мусяць бараніць. Нават найхробрайшыя і найбольш адказныя могуць засумаваць за жыццём без вайны, без надчалавечых намаганняў. Яны хацелі б жыць, як кветкі ў полі, як дрэвы і птушыная чарада, з іхнімі простымі радасцямі. Дык у гэтым наша ахвяра? А можа змаганне бессэнсоўнае? І перамога таксама? Што ўсё гэта для краіны, якая не мае межаў? Як можна абараніць яе? І перамога не лічыцца, яна не дае выніку, усё застаецца нявызначаным, як і раней. Змаганне і ахвяры не маюць канца, а радзіма так і не ўспомніць пра верных ёй, што спачылі ў зямлі. Бо змаганне надта неабсяжнае і велічнае, і яго героі незлічоныя і безыменныя. Што ж гэта за лёс, выбраннікамі якога мы ёсць!

Але калі надыходзіць ноч, некаторыя з нас падымаюцца і глядзяць у зорным святле на спустошаную, пакінутую зямлю, дзе загінулі так многія. Яны бяруць сваю зброю і крадком вяртаюцца туды, у цемру.

Я ўспамінаю воблака, якое ўбачыў колькі дзён таму, калі стаяў і глядзеў на яго цераз краты. Яно было падобнае на чалавечую галаву. Галаву чалавека з высакароднымі рысамі, чыстым і думным профілям – вобраз пыхі, ганарлівасці і вытанчанасці.

Пакуль я стаяў і глядзеў, абрысы пачалі мяняцца. Спачатку здавалася, што своеасаблівы і прыгожы твар становіцца яшчэ прыгажэй, непаўторны характар набывае больш выразнасці. Але потым узнікла нешта неспакойнае, дзіўнае і празмернае – нават нешта хваравітае, проста агіднае. Твар нібыта распаўся, пакуль я глядзеў на яго, але не згубіў падабенства са сваім былым я. Паціху ён нібыта пакрыўся праказай, згубіў дакладнасць, расплыўся ў гніенні. Урэшце вока з яго глыбокім позіркам пераўтварылася ў пустую дзірку, а ніжняя сківіца адвісла. Гэта быў ашчэраны чэрап.

Але ўсё ж чэрап меў падабенства з вялікім і прыгожым, якое я бачыў раней. Засталося нешта агульнае, нешта, што было іхняй схаванай таямніцай.

Адчай! Гэта б значыла, што я гатовы прызнаць: камора, дзе я, дзе знаходзяцца іншыя спакутваныя вязні,-- і няма больш нічога! Што гэта і ёсць жыццё. А той малы адрэзак часу, калі мы сядзім у турме, і ёсць нашым прызначэннем, нашым непазбыўным лёсам. Вось тады мы і прызнаем сябе вязнямі!

Але жыццё – гэта не тое, што заключана ўнутры нас. Яно злучае нас з жывы-

мі і мёртвымі ўсіх часоў. Са смерцю і ўваскрасеннем, З усеагульным пераўтварэннем і абнаўленнем, нязменным, з бесперапыннай раніцай стварэння.

І вось разбураны межы часу і прасторы. Воля, воля, воля!

Я шмат часу разам З воблакамі. Яны – маё таварыства, можна сказаць, мае даверлівыя сябры. Я не ведаю іхніх найглыбокіх таямніц. Але нешта я магу ўлавіць, і нейкім чынам вызначыць. Імклівы лёс не заўважае нас, жыццё мінае, нараджэнне, існаванне, смерць. Воблачны лёс, воблачныя падзеі, лунаюць вобразы, нетрывалы свет святла і я ў ім. Ён нібыта мой.

Акно так высака, што я не магу бачыць зямлю. Нібыта я пакінуў яе.

А ўначы я разам з зоркамі. Яны ззяюць зусім побач, ззяюць сваім незямным святлом.

Я нібыта пахаваны – але ў бясконцай прасторы.

Не трэба баяцца. Перад намі незлічоныя багацці, невычарпальныя магчымасці. Мы маем караблі з каштоўным грузам і загадкавыя гавані нашай душы, куды яны заплываюць пад нябачнымі ветразямі. Яны вязуць каштоўны груз, яны заўсёды ў плаванні. А смерці і галечы няма.

Няма пагібелі, няма смерці, няма бездапаможнага адчаю пасля паразы. Трэба толькі зноў сабраць сілы, вярнуцца і рабіць зноў, працягваць стварэнне. Ёсць толькі асэнсаванне і радасць пасярод ззяючай, вечнай раніцы стварэння.

Адчай! Ці ж нам адчайвацца?! Нам, што нясуць у сабе несмяротныя сілы і несмяротны покліч перамогі. Нам, што ёсць адным з найвялікшых цудаў. Нам, што нясуць у сваёй душы таямніцу дасканаласці, нясуць яе праз часы, хаця і не разумеюць яе сэнсу. Яна – непазнавальная, яна не можа ўвасобіцца ў рэчаіснасці, яе нельга дасягнуць. Яна можа жыць толькі ў загадкавым улонні абсалюту, замкнёная пячаткай, недасягальная. І калі б мы зламалі пячатку, то ўсё роўна не здолелі б спазнаць яе змест. Але жыццё штораз нараджаецца нанова, штораз зерне ламае пячатку і таямніца злучаецца з стваральнымі сіламі, аддае ім свой пераможны покліч.

Сама наша існасць ёсць вечным поклічам перамогі!

Пераклаў са шведскай ***Валеры Буйвал***

Pär Lagerkvist. *Prosa.* Stockholm, 1949.

Пэр Лагерквіст *(1891-1974) – шведскі пісьменнік, драматург, паэт. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1951). У філасофскай навеле „Вызваленне" („Den befriade människan" – 1939 г.) раскрываецца жыццясцвярджальная гуманістычная пазіцыя пісьменніка, ягонае непрыняцце гвалту і вайны.*

КАЛЕВАЛА

РУНА ПЕРШАЯ

Уступ (1 – 102). Дзева паветра апускаецца на марскія хвалі і , зацяжарыўшы ад ветру і вады, становіцца маці вады (103 – 176). Качка зьвівае гняздо на калене маці вады і адкладвае яйкі (177 – 212). Яйкі выпадаюць з гнязда і разьбіваюцца на кавалкі, якія ператвараюцца ў неба, зямлю, сонца, месяц ды хмары (213 – 244). Маці вады стварае мысы, затокі, берагі, водмелі ды глыбіні мора (245 – 280). Маці вады нараджае Вяйнямёйнена, яго даўгі час носіць па хвалях, пакуль не прыбівае да берага (281 – 344).

У мяне ўзьнікла думка,
нарадзілася жаданьне
засьпяваць, завесьці песьні
ды пусьціць за словам слова
5 старажытных песьнесьпеваў,
роду нашага паданьняў.
Растаюць у роце словы,
з вуснаў птушкаю ірвуцца,
зь языка яны зьлятаюць
10 ды паміж зубоў струменяць.
Мілы сябра, братка любы,
залатых гадоў таварыш!
Засьпявайма разам песьню
ды прамовім разам словы,
15 калі тут ужо сыйшліся,
з двух бакоў мы на сустрэчу!
Рэдка мы бываем разам,
рэдка бачымся з табою

на прасторах запусьцелых,
20 у краі Поўначы убогім.
Дык давай мне свае рукі,
моцна счэпім свае пальцы,
засьпяваем гучна песьні
ды найлепшыя паданьні,
25 каб сябры нашы пачулі,
ды паслухалі прыветна,
каб пачулі нашы дзеці,
каб пачула наша моладзь:
як зьбіралі, зьберагалі
30 тыя вершы, тыя сьпевы
ў апаяску Вяйнямёйнен,
у кузьні волат Ільмарынен,
у вострай сталі Каўкам'елі,
у джалах стрэлаў Ёўкахайнен,
35 у паўночных дальніх гонях
Калевалы верасовай.
Іх сьпяваў калісьці бацька,
калі рэзаў тапарышча,
маці навучала песьням,
40 калі ніткі выпрадала,
я ж тады дзіцёнкам малым
каля ног яе круціўся,
немаўлятка неразумны
маці малаком духменіў.
45 Словаў шмат было пра Сампа
ды пра чары хітрай Лоўхі:
і старэла ў песьнях Сампа,
зьгінула ад чараў Лоўхі,
Віпунен сканаў ад чараў,
50 Леммінкяйнен – у карагодах.
Ёсьць яшчэ нямала песень,
загавораў шмат я помню,
што сабраў я па ўзьмежках
ды з галінак верасовых,
55 ды з кустоў каля дарогі,
з розных парасткаў маленькіх,
з патаптаных сьпелых траваў,
там, дзе пасьвіў я гавяду,
у гады свае малыя,
60 пастушком хадзіў за статкам,
там, па купінах мядовых,
там, па залатых палянах
усьлед за Муўрыккі-чарнохай,
побач з Кіммаю пярэстай.
65 Насьпяваў мароз мне песьні,
дождж нашапацеў мне вершаў.
Вецер слоў яшчэ навеяў,
хвалі з мора нашапталі.
Птушкі ў шэраг словы склалі,
70 вершаліны дрэў – у сказы.
Я зматаў іх у клубочак,
у адзін маток зьвязаў іх.
Я паклаў клубок на сані,
у вазок паклаў я зьвязку,
75 песьні я прывёз дадому,
да асеці я давёз іх
і паклаў у медны кошык
пад столь клеці на паліцу.
Доўга песьні на марозе
80 у маркоце праляжалі.
Ці не ўзяць нам іх са сьцюжы,
не забраць з марозу песьні?
Ці не ўнесьці ў хату кошык,
ды на лаву тут, пад стольлю,
85 пад магутнай кроквай новай
пад прыгожаю паставіць?
Мо адчынім кошык песень,
поўную паданьняў скрынку,
каб клубок той разматаць нам,
90 разьвязаць маток легендаў?
Лепшую сьпяю вам песьню,
каб найлепей загучала,

хай дадуць мне хлеба лусту,
паднясуць мне збанец піва.
95 а калі не будзе піва,
альбо квасу маладога,
дык сьпяю я песьню нашча,
нават без вады, насуха,
каб вясёлым быў наш вечар,
100 каб уславіць дзень мінулы
ды парадаваць дзень новы,
раньне новае пацешыць.
Чуў я некалі як песьні,
дзіўнасьпеўныя складалі:
105 па адной прыходзяць ночы,
дні па аднаму сьвітаюць,
і ў самоце нарадзіўся
Вяйнямёйнен – песьнесьпеўца,
юнай Ілматар дзіцятка,
110 маладой дачкі паветра.
На паветраных прасьцягах
гожае дзіця прыроды
доўга берагла цнатлівасьць,
заставалася нявіннай
115 на паветраных падворках,
на раўнінах гладкіх неба.
Ды журба апанавала,
надакучыла дзяўчыне
век адною заставацца,
120 век самотнай ды нявіннай
на паветраных падворках,
на раўнінах гладкіх неба;
і зьляцела зусім нізка,
на марскія хвалі села,
125 на марскі хрыбет
бязьмежны,
на марскі прастор бяскрайні.
Наляцеў шалёны вецер,
ярасны віхор з усходу,
пену ён пагнаў па моры
130 ды ўзьняў высока хвалі.
Калыхаў дзяўчыну вецер
ды насілі хвалі дзеву
па марскіх абшарах сініх,
па вяршынях белапенных:
135 зацяжарыла ад ветру
і ад хвалі плод панесла.
Цьвёрды плод яна насіла,
чэрава сваё цяжкое
можа сем стагоддзяў цэлых,
140 дзевяць жыцьцяў чалавечых;
ды не наступалі роды,
незачаты не радзіўся.
Маткаю вады дзяўчына
мчала на ўсход, на захад,
145 і да поўначы, да поўдня,
да нябесных далягляда ў
у бязьлітасных пакутах,
родаў вогненных спахватак;
ды не наступалі роды,
150 незачаты не радзіўся.
Стала ціха плакаць дзева,
кажучы такія словы:
“Вохці мне, гаротнай дзеве,
і маёй няшчаснай долі!
155 Чаму раптам я з паветра
апынулася на моры.
каб гайдаў мяне тут вецер,
каб мяне ганялі хвалі
па марской вадзе бязьмежнай,
160 па марскіх бурлівых хвалях!
Лепей бы я засталася,
як раней, дачкой паветра,
чым, як зараз, чужаніцай,
маткаю вады гайдацца:
165 золка мне тут і няўтульна,

холадна мне тут, няшчаснай,
жыць на хвалях дураслівых,
плаваць па вадзе сьцюдзёнай.
Гэй ты, Укка, бог вярхоўны
170 валадар усяго паветра!
Ты прыйдзі на дапамогу,
ты прыйдзі на заклік гучны,
ты пазбаў ад болю дзеву,
а жанчыну ад пакутаў!
175 Не марудзь, а пасьпяшайся
пільная ў мяне патрэба!"
Хутка час прайшоў кароткі,
усяго адно імгненьне,
прыляцела качка-птушка,
180 б'е крыламі ў паветры,
месца для гнязда шукае,
для жытла шукае месца.
На ўсход ляціць, на захад,
і на поўнач, і на поўдзень,
185 ды знайсьці не можа месца,
нават кепскага не знойдзе,
каб там зьвіць сабе гнязьдзечка,
каб жытло сабе там зладзіць.
Пакружыла, палятала
190 і, падумаўшы, сказала:
"Ці то зьвіць гняздо на ветры,
ці жытло зрабіць на хвалях?
Дык гняздо разьвее вецер,
разьнясуць па моры хвалі."
195 Слаўная дачка паветра,
гаспадыня вод пачула,
плячо з хваляў паказала
ды ўзьняла з вады калена,
каб гняздо зьвіла там качка,
200 каб жытло сабе зрабіла.
Качка, стройная істота,
усё лятае, кружыць, кружыць,
раптам на прасторы сінім
бачыць маці вод калена
205 і за купіну прызнала,
за зялёны мяккі дзёран.
Пакружляла, палятала,
села на калена дзеве
і зьвіла сабе гнязьдзечка,
210 каб адкласьці туды яйкі:
залатых было шэсьць яек,
сёмае – было з жалеза.
Пачала выседжваць яйкі,
награваць калена дзевы,
215 дзень сядзела, два сядзела,
трэці дзень калена грэе.
Маці водаў, дзева неба,
гаспадыня мора чуе,
што агнём гарыць калена,
220 скура, як агонь палае;
думае: згарыць калена
і ўсе жылы там растануць.
Так каленам варухнула,
здрыганулася ўсім целам,
225 што ў ваду зьляцелі яйкі,
на марскую хвалю ўпалі,
ушчэнт разьбіліся аб воды,
патрушчыліся ў кавалкі.
Не прапалі яйкі ў твані
230 у глыбінях вод кавалкі,
выгляд набылі цудоўны,
усе зьмяніліся дзівосна:
ніжняя часціна яйка
стала маткаю-зямлёю,
235 верхняя часьціна яйка
небасьхілам стромкім стала,
верхняя жаўтка часьціна
сонцам зазіхцела яркім,
верхняя бялка часьціна

240 ясным месяцам зазьзяла,
што было пярэстым ў яйках
стала зоркамі на небе,
а цямнейшыя часьціны
сталі хмарамі ў паветры.
245 Час ідзе сабе наперад,
год за годам прабягае,
сьвеціць маладое сонца,
новы маладзік зіхцее.
Усё плыве, дачка паветра
250 гаспадыня – маці водаў,
па вадзе плыве спакойнай,
па туманных плыве хвалях,
перад ёй – вада безь межаў,
неба сьветлае – за ёю.
255 Дзевяць год так праляцела,
наступае год дзесяты –
галаву над роўняй мора
узьняла дачка паветра
ды ўзялася за стварэньне,
260 пачала тварыць тварэньні
на марскіх хрыбтах празрыстых
на абшарах вод адкрытых.
Як рукою дзе кранала --
мыс за мысам узьнімаўся,
265 дзе нагой дно даставала –
ямы рыбныя ўзьнікалі,
там, дзе бурбалкі пускала –
цёмныя віры глыбелі.
Дзе зямлю кранала бокам –
270 роўны бераг там рабіўся,
а нагой чапляла сушу –
ласасёвыя затокі;
галавой ледзь закранала –
бухты малыя стварала.
275 Адплыла ад сушы далей
ды спынілася на хвалях –
пад вадой узьніклі скалы,
камяні на дне ўзьняліся
караблям ды мараходцам
280 на нянацкую пагібель.
Выспы вось ужо гатовы,
скалы створаны ў моры,
небакрай вятры падпёрлі,
землям дадзены найменьні,
285 знакі на каменьнях бачны,
рэзы выразаны ў скалах,
толькі вечны песьнепеўца
Вяйнямёйнен не радзіўся.
Векавечны Вяйнямёйнен
290 у цёмным чэраве блукае,
трыццаць летаў там прабыў ён,
гэтулькі ж і зім халодных
на марскіх прасторах сьветлых,
на марскіх туманных хвалях.
295 Вось ён думае, гадае,
што ж рабіць яму тут далей,
у цёмным патаемным месцы,
у жытле маленькім цесным,
дзе маладзіка і сонца
300 ён ніколі там не бачыў.
Ён такія словы мовіў,
ён сказаў такія словы:
“Месяц, сонца залатое,
ты, Мядзьведзіца, на небе,
305 навучыце, памажыце
адчыніць мне тыя дзьверы
ды гняздо маё пакінуць,
маю цесную хаціну!
Пакажыце мне дарогу,
310 шлях да берага дзіцёнку,
каб пабачыць месяц ясны,
сонцам сьветлым захапляцца,
на Мядзьведзіцу дзівіцца,

паглядзець на зоркі ў небе!”
315 Не пусьціў на волю месяц,
сонца шлях не паказала.
Патрываў ён яшчэ крышку
і жыццё такое ўстыла:
моцныя хіснуў вароты
320 безнайменным сваім
пальцам,
адамкнуў замочак з косьці
малым пальцам нагі левай,
на лакцях сьлізнуў з парога,
з сенцаў на каленях выйшаў.
325 Ён зваліўся ніц у мора,
паляцеў рукамі ў хвалі,
муж на волю мора аддаўся
і герой застаўся ў хвалях.
Пяць гадоў ён там гайдаўся,
330 пяць і шэсьць гадоў
спадраду,
сем і восем год праплаваў,
ды нарэшце супыніўся
каля мыса без найменьня,
ля зямлі зусім бязьлеснай.
335 На калені муж узьняўся
ды на локці абапёрся,
устаў пабачыць месяц ясны,
сонцам сьветлым захапляцца,
на Мядзьведзіцу дзівіцца,
340 паглядзець на зоркі ў небе.
Так радзіўся Вяйнямёйнен,
роду мужны песьняпеўца,
вынашаны дзевай неба,
Ілматар, дачкой паветра.

РУНА ШОСТАЯ

Ёўкахайнен злуецца на Вяйнямёйнена і падпільноўвае яго па дарозе ў Пох’ёлу (1-78). Ён бачыць, як Вяйнямёйнен пераязджае на кані праз рэчку, і страляе з лука, але страла трапляе ў каня(79 – 182) . Вяйнямёйнен падае ў ваду, моцны вецер выносіць яго ў адкрытае мора (183 – 234) і Ёўкахайнен радуецца, думаючы, што стары песьняпеўца болей ніколі не сьпяе новых песень.

Стары мудры Вяйнямёйнен
неяк вырашыў наведаць
вёску сцюжную ў далёкай
цёмнай Пох’ёле халоднай.
5 Конь ягоны быў саловы,
сьветлы, як сьцябло гароху.
Залатой зцугляў аброцьцю,
кантар срэбраны накінуў,
вершкі на каня садзіцца
10 і сядзібу пакідае.
Паляцеў ён па дарозе,
шпарка мерыць шлях далёкі ,
на кані саловай масці,
сьветлым, як сьцябло гароху.
15 Едзе Вяйнёлы палямі,
верасамі Калевалы,
конь імкліва лічыць вёрсты,
хата родная зьнікае,

карацее шлях далёкі.
20 Вось марскім хрыбтом ён едзе,
па адкрытай роўні мора,
капыты ў каня сухія,
ногі у вадзе не мокнуць.
Хлопец малады лапландзкі,
хударлявы Ёўкахайнен,
25 у душы хаваў варожасць,
з даўняе пары зайздросціў
Вяйнямёйнену старому,
векавечным яго сьпевам.
Вогненны ён лук наладзіў
30 і дугу яго аздобіў:
выгнуў лук сабе жалезны,
а дзяржак мядзяны выліў,
залатой пакрыў аздобай,
срэбрам рупна ўпрыгожыў.
35 Дзе ж ён адшукаў вяроўку,
цеціву з чаго зрабіў ён?
Узяў ласінай жылы ў Хійсі,
ніткі ільняной – у Лемпа!
Вось гатовы стромкі выгін,
40 праца скончана над лукам.
Ён цудоўны быў на выгляд,
пэўна каштаваў нямала:
конь на выгіне нясецца,
збоку жарабя імчыцца,
45 сьпіць дзяўчына на загібе,
ля зарубкі зайка дрэмле.
Нарабіў ён безліч стрэлаў,
мноства тройчы іх апёрыў,
стрэлы ён выточваў з дуба,
50 а канцы з галін смалістых.
Майстраваў ён тыя стрэлы
ды апёрваў іх адразу
пер'ем ластаўкі маленькай,
вераб'інымі крыламі.
55 Вось гартуе тыя стрэлы,
наканечнікі іх сыціць
зьмеяў страшнаю атрутай,
гадаў чорнаю крывёю.
Як закончыў усе стрэлы,
60 цеціву на лук напнуўшы,
стаў чакаць старога Вяйнё,
пестуна марскіх заліваў.
Вечарам чакаў і ўранку,
пільнаваў сьпякотным поўднем.
65 Вяйнямёйнена нястомна
цэлы тыдзень ён чакае,
выглядае праз вакенца
ды цікуе з-за адрыны,
слухае каля дарогі,
70 вока з поля не спускае,
за сьпіной калчан паўнюткі,
лук пад пахай нагатове.
Пільнаваць падалей выйшаў,
з-за другой ён сочыць хаты
75 з края вогненнага мыса,
ля затокі з лукавіны,
з агнявога вадаспаду,
ад святой бурлівай рэчкі.
Вось аднойчы на сьвітаньні
80 толькі раньне засьвяціла,
ён акінуў вокам поўнач,
потым стаў да сонца тварам:
кропку чорную заўважыў,
штосьці сіняе на хвалях
85 „Можа хмарка там на ўсходзе,
ці дзяньніца ўзнялася?"
То не хмарка там на ўсходзе,
не дзяньніца паднялася –
гэта мудры Вяйнямёйнен,
90 векавечны песьняпеўца.
У Пох'ёду ён кіраваўся,

ён імчаўся ў Піментолу
на кані саловай масьці,
сьветлым, як сьцябло гароху.
95 Малады ж той Ёўкахайнен,
хлопец збэшчаны лапландзкі,
ухапіў свой лук цудоўны,
вогненны свой лук наладзіў
Вяйнямёйнену на згубу,
100 на сьмерць мужу Сувантолы.
Пачала пытацца маці,
так пыталася старая:
„На каго ты лук наладзіў,
абкаваў яго жалезам?”
105 Малады ж той Ёўкахайнен
дзёрзка ў адказ прамовіў:
„Я на тое лук наладзіў,
абкаваў яго жалезам
Вяйнямёйнену на згубу,
110 на сьмерць мужу Сувантолы.
Вяйнямёйнена я зьнішчу,
зьгіне вечны песьняпеўца,
стрэламі праб’ю я сэрца,
ды пячонку, ды рамёны.”
115 Маці ж не дае дазволу
і страляць забараняе:
„Вяйнямёйнена пакінь ты,
не губі ты калевальца!
З роду моцнага той Вяйнё,
120 да таго ж ён мой пляменнік.
Вяйнямёйнена заб’еш ты,
Калевы пясьняр загіне –
і загіне ў сьвеце радасьць,
песьня на зямлі пагасьне.
125 Радасьць лепей тут, на сьвеце,
на зямлі прыемней песьня,
чым у Манале падземнай,
пад скляпеньнем Туонелы.”
Малады тут Ёўкахайнен
130 некаторы час падумаў,
прыпыніўся на хвілінку:
„Біць!” – адна рука жадала,
адмаўлялася ж другая
амываць крывёю пальцы.
135 Вось нарэшце ён прамовіў,
вымавіў такія словы:
„І няхай сабе загіне,
хоць і двойчы ў сьвеце радасьць,
хай усе пагаснуць песьні –
140 сьмела выпушчу я стрэлы.”
Вогненны свой лук напружыў,
нацягнуў акуты медзьдзю,
зь левага калена цэліць,
стаў на правае калена.
145 Выняў ён стралу з калчана,
узяў апёраную тройчы,
выбіраў стралу палепей,
самы хуткі стрыжань выбраў,
вось прыклаў яе да лука,
150 да тугой ільнянай ніці.
Вогненны свой лук узняўшы,
да пляча яго прыставіў
і намерыўся страляць ён,
у Вяйнямёйнена нацэліў,
155 словы гэткія прамовіў:
„Трапным будзь ты, наканечнік,
бі мацней, сасновы стрыжань,
цеціва слізгай льняная!
Як рука пацэліць нізка,
160 хай страла імчыцца вышай,
а калі высока возьме,
хай страла ніжэй ударыць!”
Моцна цеціву рвануў ён,
першую стралу пусьціўшы,
165 ды высока паляцела –

па-над галавой у хмары,
у стракатыя аблокі,
прама ў пахмурнае неба.
Ён на гэта і не зважыў,
170 выпусьціў стралу другую,
тая нізка паляцела,
увайшла ў зямлю-матулю,
у Манале быць захацела,
там зарыцца ва ўзгорак.
175 Хутка стрэліў ён раз трэці:
гэтая страла папала
ў шыю сіняму аленю
Вяйнямёйнена старога.
Цераз левую падпаху,
180 цераз мяса ля лапаткі –
так забіў каня той масьці,
што падобна да гароху.
Векавечны Вяйнямёйнен
пальцамі ў ваду зваліўся,
185 ён упаў рукамі ў пену,
у шумныя марскія хвалі
са сьпіны ласінай сіняй,
з жарабка саловай масьці.
Тут узьняўся моцны вецер,
190 хвалі грозныя ўзьнясьліся,
Вяйнямёйнена панесла,
ад зямлі яго пагнала
на прасторы вод шырокіх,
на бурлівыя прасьцягі.
195 Стаў хваліцца Ёўкахайнен,
дзёрзкі малады хлапчына:
„Гэй, старэча Вяйнямёйнен,
болей ты ў жыцьці ніколі
залаты не ўбачыш месяц,
200 і нага твая не ступіць
на паляны Калевалы,
Вяйнёлы абшар зялёны!
Шэсьць гадоў па моры плаваў,
сем гадоў ты там гайдаўся,
205 восем год насіцца будзеш
па марскіх бурлівых хвалях,
па марскіх абсягах пенных,
шэсьць гадоў – камлём яловым,
бервяном сасновым – сем год,
210 восем год, як пень карчавы!”
Вось вярнуўся ён дахаты,
маці так яго спытала:
„Дык няўжо забіў ты Вяйнё,
сына Калевы ты зьнішчыў?”
215 Ёй прамовіў Ёўкахайнен
у адказ такія словы:
„Вяйнямёйнена забіў я,
сына Калевы я зьнішчыў,
мора зараз падмятае,
220 хвалі яно мяце старанна.
У каламуць вады пясчанай,
у мутныя ад жвіру хвалі
пальцамі стары зваліўся,
ськінуўся ўніз рукамі,
225 павярнуўся потым бокам,
на сьпіну перакуліўся,
па марскіх панёсься хвалях,
па марскіх вірах бяздонных!
Маці так яму сказала:
230 „Ты, нягоднік, дрэнна зробіў,
што забіў старога Вяйнё,
сына Калевы ты зьнішчыў,
Сувантолы моц і веліч,
Калевалы аздабленьне.”

Пераклаў з фінскай мовы
Якуб Лапатка
(Прамы пераклад з фінскай на беларускую робіцца ўпершыню)

ПЕРАКЛАДЫ АЛЕНЫ ТАБОЛІЧ І ЗМІЦЕРА ЗАНЕЎСКАГА

TRANSLATEDS BY ALENA TABOLICH & ZMICIER ZANEVSKI

ІРЛЯНДСКАЯ ПАЭЗІЯ

Знакаміты Оскар Ўайлд (1854-1900), драматург, літаратурны крытык, пісаў такасама вершы і паэмы.

Шэймус Хіні (н. 1939), лаўрэат Нобелеўскай прэміі, вядомы як адзін з выбітнейшых паэтаў Ірляндыі.

Іан Мак а'Гобхэйн (н.1928) піша вершы на ангельскай і гаэльскай мовах.

Іан Духіг (н.1954), які жыве ў г.Лідс, вось так піша пра ірляндскую мову:

Іан Духіг/ Ian Duhig

З ірляндскай

Паводле Дайніна, мову гаэлаў
не перасягне ніводны лексікограф.
Месяц – белае кола ў скрыліку
сырой бульбіны ці рэпы. Зорка –
гэта знак на ілбе звера,
а сонца – дно возера ці крыніцы.

Дык, калі я скажу, што
твой твар як скрылік сырой рэпы,
валасы твае колеру дна возера,
а ў зрэнках тваіх вачэй
знак звера, гэта таму, што
я хачу кахаць цябе паводле Дайніна.

Оскар Ўайлд/ Oscar Wilde

Сімфонія ў жоўтым

Як жоўты матылёк, паўзе
Праз мост вялікі омнібус
Трывожны, крыху стомлены,
То тут, то там нехта прайдзе.

А баржы з сенам залатым
Плывуць ля цёмнага прычалля.
Хоць шоўку жоўтага нямала,
густы туман навіс, як дым.

Лісточкі жоўтыя злятаюць,
Кружляюць па-над рэчкаю,
І быццам жоўтай свечкаю
нефрыты ў Тэмзу рассыпаюць.

У лесе

З краю, дзе лес глыбокі,
Туды, дзе святло трымціць,
Прыгожы ды цёмнавокі
Мой файны фаўн ляціць.

Праз гаі гучыць песня,
І цень танчыць за ёй.
А мне – ну хоць трэсні:
За чым гнацца? Вой, вой!!

О паляўнічы, дзе твой цень?
О салавейка, дзе твой слых?
У палоне музыкі, стары я пень,
Ой, не знайсці мне іх!

Шэймус Хіні/ Sheamus Heaney

Капальнікі

Між пальцамі маімі самапіска
Уселася ўтульна, зусім блізка,
Пад акном, лапата скрыгоча –
У грунт гравійны лезці не хоча.
Бацька капае. Гляджу ўніз –

Сярод кветак стракатых на клумбах
Ён напружана сагнуўся, шмат гадоў
Таму ён і бульбу так капаў,
Рытмічна працуючы ў баразне.

Гаматны бот націскаў на рабро
Лапаты. Ручка ўпіралася ў калена.
Выкідаў бульбоўнік, глыбока ўтыкаў штых,
Каб ляцелі халодныя бульбіны,
Што радасцю лашчылі нашы рукі.

Дальбог, стары ведаў, як варочаць лапатай,
Ня горш за свайго бацьку.

Дзядуля вырабляў за дзень больш торфу,
Чым хто йншы на нашым балоце.
Прынёс я яму аднойчы малака.
У бутэльцы корак з паперы. Выпіў
І зноў за працу – апланоўваў,
Наразаў, кідаў праз плячо дзярніну.
Усё глыбей за добрым торфам.
Капаў.

Свежы водар бульбянішча, хлюпат каранёў
Параненых – усё як жывое ў памяці.
Але няма ў мяне лапаты.

Хіба што між пальцаў маіх
Самапіска.
Буду ёю капаць.

Балотная зямля

У прэрыях
вечаровае сонца
згарае за небасхілам,
а ў нас цьмяныя зоркі

тонуць у зрэнках азёраў.
Іх колер з'ела ймгла
нашых лагчын і долаў.
У музеі захавала зямля

поўны набор шкілета
Ірляндскага Лася, канструкт,
Які трымае паветра.
Адны косці. А такі прадукт,

Як масла ў занядбаным склепе
ляжала не год, а гадамі,
ды не страціла ні смак, ні колер.
А зямля, прабітая прамянямі –

цярпліва пладавітая, вечная
прэла мільёны гадоў
і засталася зямлёю. Таму
вугаль тут ніхто не знайшоў.

Тут ёсць рэшткі траў
і дрэў, перагніўшых у торф.
Навуковец беражліва зразаў
Соты культурны слой

І ціха знаходзіў той,
дзе чалавек зрабіў стаянку
На беразе бяздоннага возера
З яго некранутай глыбінёй.

Ліхтарык глогу

Хоць глогу ваганёк і прыпазніўся,
Гарыць ён шчэ зімою ў кустоўі,
Не вельмі слепяць зрок яго ўзоры,
Ды заклікае кожнага захоўваць
Свой сціплы кнот супраціўлення.

Марозным днём, калі клубамі пара
з вуснаў ён набывае вобраз
Бадзягі Дыягена, што днём з агнём
Шукаў паўсюдна чалавека.

З цікаўнасцю глядзіць на вас,
Падняў на кволым дубчыку ліхтарык.
І вы ў дрыготках ад гэтага пагляду,
Ад бадзяка, што вам вось з пальца
Возьме крыві ён пробу, ад экрану,
Што вас наскрозь прайме – і годзе!

Іан Мак А' Гобхэйн/ Iain Mac a'Ghobhain
Іан Крычтан Сміт/ Iain Crichton Smith

Ссылкі

Шмат караблёў адплылі з краіны
белакрылай у Канаду.
Яны, як хустачкі ў памяці.
а мора, як слёзы.
На мачтах маракі пяюць,

Як птушкі на дрэвах.
Майскае мора сіняе-сіняе,
уначы поўня, днём сонца.
Месяц, як жоўты яблык,
Як талерка на сцяне,
да якой цягнуць рукі,
як срэбны магніт
з прамянямі,
што пранізваюць сэрца.

Сава і мыш

Сава ляціць дамоў, у дзюбе мыш.
Высока ў небе поўня дзіўна свеціць.

Залаты камень, цьмянае святло.
Лупатая сава сядзіць на дрэве.

Усё здаецца вечным, каб не мыш
Парваная струна ў гармоніі

аркестра, які ўмела грае
бязгучную мелодыю сваю.

Ales Rasanau / Алесь Разанаў

ON THIS LAND

Some people ask me to show the way to the East,
Other people – the way to the West....

As if at crossroads, I show the way to all of them,
but I myself remain in the same place,
on this very land, under this blue sky.

I'm too light to go deep into the depths,
too heavy to fly high to the Heavens.
Too spiritually balanced to go
in any direction...

This is my left hand, and this is my right hand...
I throw a seed into soil, and it gives birth to a tree:

one bough is shining in the smiling sun,
the other is moonlit,
and many rich-voiced melodious birds from all over the world,
sitting on the boughs, sing their sweet songs and make their nests...

Here's my West, here's my East.

***

Images constantly tempt me to follow them,
but as soon as I try to do that, they are like birds
which keep those who are going to leave
their hidden nests from doing the dreadful thing.

The long winding paths lead to the East,
and to the West, but at every step you make, everywhere
there appears a steep loftiness above them, and,
rising over itself, it immediately turns
into the mind of the body; rising over itself,
the mind turns everything into understanding, which
like water-bearing vessels, imbue and nourish every word
you say, every step you make, with their vigour.

A human thing means two men, who are like two
palms, which, together, make a snowball or
throw it over, from hand to hand, to keep the heat:
one of them is a start, the other is an end,
one of them is a source, the other's a confluence,

one is a cause, the other is its result,
one of them is a question, the other is an answer;
between them are the words, rising
out of them and flowing into them.

Everything that moves me to tears, is just like myself.
The day of creation isn't yet over: again and
again the Man shapes his better future and destiny.

Stop, linger, wait, let your desire be free,
and you will not be a small creature, antogonistic
to everyone, and the birds will come back to you,
the birds that you cannot catch, when you set snares,
the birds that hide somewhere, when you search for them,

and you will hear: each bird or birdie
sings like you, and you will see:
each bird looks like you.

Nil Hilevich / Ніл Гілевіч

***

Late at night the rain
is whispering something
to the apple tree.
And I will stay out of doors
and remember all I can.

***

Flower after flower.
have faded and withered
in my little orchard.
I feel sad. My sun will soon
stop shining brightly to me.

Mikhas Skobla/ Міхась Скобла

***

Rain was running aslant to the sea,
It couldn't run straight because of the shoal.
The sward of the bar was tempered like steel
In the foamy waves that rose and rolled.

The wind was wiping its face with the fog.
The light had dimmed. Two shadows departed.
Shaking its head like a big hedgehog,
An old chestnut tree suddenly startled.

Translated by ***Alena Tabolich***

Філіп Ларкін/ Philip Larkin

Дні

Навошта нам дні?
У днях мы жывём.
Яны абуджаюць нас
Кожным ранкам.
Дні нам патрэбны для шчасця:
Дзе яшчэ жыць, як не ў днях?

Адказ на гэта пытанне
Нясуць нам святар і доктар
У сваіх доўгіх плашчах,
Спяшаючыся здалёк.

***

Цяпер і я кажу:
„чвэрць стагоддзя"

ці „трыццаць гадоў таму”
аб сваім жыцці.

Ад гэтага займае дых,
бы ўверх нясе
і зноў кідае долу
ў бяздонным небе.

Усё, што яшчэ здарыцца, –
нехта памрэ (і я таксама).
Калі і як гэта будзе,
пакуль невядома.

Недасягальнае

Між зорных выспаў ёсць
Пустэчы змроку, дзе
Рой цьмяных светлякоў
Бы ў паветры плыве.

Ім не далі імёнаў.
Вандроўнікам ўначы
Не радуюць вачэй,
Не кажуць шлях яны,

Бо іх няўлоўны бляск
Людскому воку:
Хавае невядомае
Пустэча змроку.

Вада

Каб веру ізноў
Мне шанц прапаноўваў
Стварыць, я б успомніў ваду.

Наведванне храму
Было б як пераапрананне
ў новую, сухую адзежу.

Імша ўключала б у сябе
Вобразы адданага,
Шчырага аблівання,

А на Ўсходзе б я ўзняў
Шклянку з вадою,
Бы светлы сабор,
Дзе бясконца сыходзяцца
промні.

Сумны дом

Дом застаецца – сумны, бы ўспамін
Пра тых, што будавалі для сябе,
А потым адышлі. А вось адзін
Дом змен цураецца і ўсё заве
Назад звярнуцца сведкаў тых часін.

Калі яшчэ ён поўніўся жыццём
І ведаў, што і як павінна быць.
Мінула ўсё. Ды след пакуль відзён:
Глядзі – карціны, посуд ў шафе; спіць
Нямое піяніна. Стары вазон...

***

Першае, што я
Добра зразумеў:
Час – бы сякеры звонкі стогн
У целах дрэў.

На золку
Прачнуцца ды пачуць

Ад пеўня спеў далёкі,
У вакенца зазірнуць –
А там плывуць аблокі, –
Так дзіўна, калі ў цябе
Абыякавы золак на сэрцы,
Як той, што ў вакенцы.

***

Усё, што кожны дзень
Мы робім для сябе,
Знікае, быццам цень,
Або далей жыве.
Вось дзіўная павязь:
Чаго прычына – мы
Вярнецца праз гады,
Спрычыніцца да нас.

Пераклады з ангельскай – ***Зміцера Занеўскага***

Томас Транстромэр/ Tomas Tranströmer

До-мажор

Калі ён вяртаўся ад любай свае,
снег віраваў навокал.
Зіма паспела прыйсці,
пакуль былі яны разам.
Святлом зыходзіла ноч.
Ён не чуў ног ад шчасця.
Горад застаўся ўнізе.
Людзі, што йшлі насустрач –
кожны ўсмешку хаваў за каўнер.
Было вольна!
І ўсе пытальнікі спеў пачалі аб прысутнасці Бога –
так падалося яму.

Вось узнік вольны напеў
і доўгім крокам памкнуў
праз буйны снег.
І ўсё няслося да гуку „до”.
Компасу стрэлка – дрыжэла на „до”.
Гадзіна без смерці ды болю.
Было лёгка!
За кожным каўнерам хавалася ўсмешка.

Біргер Норман / Birger Norman

Чужынец

Не думай, што свабода не можа памерці.
Шмат хто ўжо бачыў дзень яе смерці.
Яны ведаюць, бо яны лілі слёзы.

Дык не вярзі ж глупстваў пра ідэалы.
Мо й табе шчэ прыдзецца ісці за труною свабоды.

І вось, калі апасля напаткаеш чужынца,
Злаві яго позірк.
Зазірні глыбей у ягоныя вочы.

Ёста Огрэн/ Gösta Ĺgren

Жыццё і плач

Бязвольны
ўсё жыццё
глытае слёзы.

А моцны
іх глытае
ўсім жыццём.

Спадчыннасць

Іспытамі на разумнасць
бароніць сябе эліта
ад простых. Дзеля таго
іх дзяцей адвучаюць ад
думак перад іспытам.
Гэта нялёгка. Ды
толькі разумныя вучацца,
а вось дурныя –
ніколі.

Бруно К. Ойер /Bruno K. Oijer

***

Ён Так моцна Жадаў Цябе, Што
Узяў І Адсёк Сабе
Усе Пальцы

А Твой Нумар Набраў Языком

Цяпер Увесь Час Чуе
Ён Твой Дзівосны Смех

Петэр Курман/ Peter Curman

Што ж на самой справе адбываецца?

У кожным з нас
гучыць маналог
думкі за шклом
амаль няўлоўныя

але непазбыўныя,
бы паветра, якім дыхаеш
ці вада, якую п'еш.
Усюды з табою,
нібы недарэчны шлягер,
які не спяваецца,
ад якога ніяк не адчэпішся.
А ноччу,
калі ява раствараецца ва ўяўнасці,
ты бяжыш,
нібы апантаны
ўкруг, ўкруг
па сваіх уласных слядох.
Што ж на самой справе адбываецца
глыбока ўнутры нас,
у тым нямым пласце,
што ёсць самае
дно жыцця?

Дыялог

Вітанні! Як маецеся?
(боль! боль! боль!
бессань! бессань! бессань!
хвароба! хвароба! хвароба!
бездапаможнасць! бездапаможнасць! бездапаможнасць!).
Дзякуй, нічога. А самі?

Стыг Ларсан/ Stig Larsson

Багі

Два багі стрэліся – і здзівіліся,
Бо кожны лічыўся адзіным.
І вось

стала двое адзіных. Вось стала двое
багоў.
Што ім рабіць? Яны разважаюць.
„Я – дэман таксама," – кажа адзін
амаль самазадаволена.
„А я – толькі бог," – адказвае другі.
„Тады мы маглі б разысціся," – думаюць абодва.
(Не пайсці ў розныя бакі, не,
а проста адысці адзін ад аднаго).
Першы – вельмі добры, ў памкненнях
і памылках. Другі –
добры не менш,
але з дэманічнай усмешкаю,
быццам прапаленай тоўстай цыгарай.
Ім не разысціся,
яны побач заўсёды.
Часам яны размаўляюць, але часцей
проста думаюць,
маўкліва думаюць.

Ларс Люндквіст/ Lars Lundkvist

Паездка

Пакуль я гашу вогнішча
там, каля возера, Карын кажа:
„Я хутка страчу зрок,
Так сказаў лекар."

Ёй адзінаццаць,
зрок – 0,3.

„Але гэта нічога,
я амаль усё бачыла."

„Учора я бачыла ў снезе
сяміканцовы лісток."

„Ён гэтую ноч, у хусцінцы,
Правёў пад маёю падушкай.”

Сонца і лёд.
Канькі, што пабліскваюць у промнях.

Бертыль Петэрсан/ Bertil Petersson

Двое

Чалавецтва –
гэта проста сінонім
калектыўнай самотнасці.

Хай адзін –
яшчэ і не лета.
Двое –
гэта ўжо не зіма.

Гунар Экелоф/ Gunnar Ekelöf

****

Каханне – той жа хірург,
яно рэжа цябе, нібы нож,
заўсёды ля самага сэрца.
Яно можа нават абрэзаць…
Ты мне не верыш?
Дарэмна! Каханне змяняе
тваю скуру й твае валасы,
ты нат не пазнаеш свае хады.
Ад кахання няма ратунку,
хіба што – хірурга нож.

Пакутаваць – цяжка.
Пакутаваць не кахаючы – цяжка.

Кахаць без пакут – немагчыма зусім.
Кахаць – цяжка.

Урбан Торнхамн/ Urban Tornhamn

Бы цёплы румянец шчакі

Адкінь усе гэтыя сымбалі!
Мы адчуваем тое, што нябачна нікому.
Мы бачым тое, што не адчувае ніхто.
З тваіх таямніц
нараджаюся я.
З маіх таямніц
нараджаешся ты.
Таямніца ў тым, што адзін аднаму
мы непарыўна належым.

Бы цёплы румянец шчакі
належыць заўсёды свайму твару.

Пераклады з швэдскай – ***Зміцера Занеўскага***

Алена Таболіч *– дацэнт Мінскага лінгвістычнага універсітэта, лектарка і перакладчыца. Яе кнігі „Срэбны дождж": пераклады з англамоўнай паэзіі (1999) і „Таямніцы мастацкага перакладу" (2004), адна з аўтараў Англійска-беларускіх слоўнікаў (1989, 1995, 2004).*

Зміцер Занеўскі *– выпускнік Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта, перакладчык. Стажыраваўся ў Швэцыі. Перакладае з ангельскай і швэдскай моў. Дыплом прысвяціў паэтычным перакладам.*

БЭРТАЛЬТ БРЭХТ
Bertholt Brecht

Пра спакушэньне анёлаў

Анёла альбо не чапай, альбо лапай хутчэй,
З налёту ў пад'езд валачы і лезь пад хітон,
Заткні яму рот языком, пакуль не ачухаўся ён,
І ўвінчвай, шуруй, а як з лытак яму пацячэ,
Рачком да сьцяны прыхілі, задзяры фартушок
І, як з горла ягонага вырвецца здушаны стогн,
Трымай яго моцна і двойчы яму запістонь,
Ня даўшы экстазу ператварыцца ў шок.

Хай юрзае дупкаю спраўна, анёлу скажы,
Яечкі табе хай пальцамі перабірае,
І толькі калі між зямлёй і раем ён залунае,
Бясстрашна валі дагары і ад шчырай душы
Пярдоль яго ў душу, ды толькі, калі затрапеча,
У твар не глядзі і крыл не зламай, чалавеча.

Саўна і спалука

Сьпярша ў нас ябуцца, а лазьню прымаюць пасьля.
Чакаеш, калі над балейкай нагнецца, і вось
Любуешся голенькім задам, і лёгенька коўзь!–
Па кульшачках, як бы жартуючы, ненаўмысьля,

Трымаеш яе ў пазыцыі, потым здабычай
Хай будзе ёй гер: хай сама на яго садзіцца.
Калі ж ёй прысьпічыць спачатку падмыцца,
Уваж,– хай, як вучыць нас продкавы звычай,
Паслужыцца ў ваньне. Хай кіпнем ліне на каменьне,
Клубамі ў шыпеньні каб пара ўвышкі ўзьляцела,
Адхвошча пяшчотна цябе бярозавым вецьцем,
Бальзам уліе ў душу, і на гэтым сьвеце
Адкрыецца рай, і прыме твой дух асьвяжэньне,
І прыйдзе чысьцец, і змые аб'ёбіны зь цела.

Спанатры каханьня

Ня так яно, каб асалодай зноў
Не спакушаўся наш юрлівец гер,
Ён паўстае і свой сьвяты намер
Увасабляе ў вобраз вабных сноў.
О, гэты лёгкі цік твайго задка,
Даўно чаканы знак, – хітруе плоць!
Раскоша той, якую самахоць
Удабралашчыць надзіцца рука .

Развод каленцаў! О яна – спалучка!
І дрогкасьць – знак, што мускулу пара
Спатоліць юр зноў прагнага нутра!
О кволы выгін! Лена гладзіць ручка,
З усьмешкаю!..
О еднасьць нашых цел!–
Тым лепшая, чым лучыш нас часьцей!

Ёган Вольфганг Гётэ
Johan Wolfgang Goethe

XXIII

Вось запаведнік чароўны, я кветак любові чакаю,
Музы дагледзелі сад, мудра пасеялі тут.
Я ж чаранок пладаносны, ствол залаты існаваньня
Радасна сам пасадзіў, шчасьця чакаю цяпер.
Службу нясі, мой прыапе*! Чаго мне баяцца дарэмна
Злодзеяў! Сей і зрывай кветкі цудоўных уцех.
Толькі ханжоў ня пускай, зласьлівых і кволых няздольцаў;
Прыйдзе каторы, зірне ў засень любві, аплюе
Чыстай прыроды дарункі – сьмела кладзі на яго
Сьцёгнаў праведны гнеў – кроўю наліты ражон!

Пераклаў ***Дзядзька Васіль***

**) Рэліктавы чарвяк, што ўсьвідроўваецца ў грунт. Нагадвае penis.*

Марні Вудроў
Marnie Woodrow

САБАЧАЕ ЖЫЦЬЦЁ

У Ідэн Хавард ёсьць адзін яркі ўспамін зь дзяцінства. Зьвязаны ён з сабакам. І хаця гэты сабачы досьвед быў зусім непрыемны, ён усё ж не абверг ейнай любові да сабак. Было ёй тады пяць, ці шэсьць, і была яна здурэўшы па суседзкай нямецкай аўчарцы – псіне з дзікаватымі вачыма па мянушцы „Лінда". Яна аж шалела за гэтай Ліндай з ўсімі яе блохамі, слінявым носам і сьмярдзючай поўсьцю. І ўжо калі дзе і можна было яе знайсьці, так гэта ля сабакі, дзе яна, седзячы на карачках, будзе шаптаць яму нешта бясконца пяшчотнае. Сабака ведаў усё, што толькі можна было ведаць, з жыцьця няшчаснай Ідэнавай сям'і.

– Не чапай сабакі, калі ён есьць, – сказалі Ідэн рослыя постаці дарослых.

– Лінда любіць мяне! – заўпарцілася Ідэн. Ну й, вядома, яна тут жа павярнулася й ляпнула Лінду па сьцёгнах – акурат калі сабака, звычайна рахманы, пад'ядаў сваю вячэру – наўмысна дзеля доказу, што Лінда любіць Ідэн безумоўна.

Ненавідзела Лінда таксама безумоўна і адказала на сяброўскую Ідэнаву тузанку скрыгатам зубоў. Пасьля шаснаццаці швоў Ідэн атрымала першую „а-што-я-табе-гаварыў" дозу ад тых самых дарослых. Але яе любоў да Лінды, як і павага да яе пэрсанальных межаў, толькі паглыбелі. Зрэшты, гэта, напэўна, і стала пачаткам яе дзівацкай жарсьці, і нават апантанасьці, да сабак.

Ідэн не дазвалялі мець свайго сабаку. Яе бацькі валодалі глыбокім ахоўным пачуцьцём у вадносінах да белага калматага дывановага насьцілу ў іхнай хаце і адмовіліся прымаць жывёл якога б там ні было віду, уключаючы і homo sapiens, абутых у чаравікі. Ідэн узьненавідзела гэтыя дываны, таму што яны паўсталі паміж ёй і магчымасьцю мець свайго собскага любага шчанючка. Сабакі, як сказала мама, толькі то й робяць, што жаруць, нагаўняюць і згрызаюць анціквар зараз жа, як толькі ты да іх сьпіной.

– Я буду сачыць за ім, – абяцала Ідэн, але маміна рашэньне было канчатковым.

– У твайго бацькі алергія, – сказала мама, хаваючы вочы.

– А што, Лінда багата нагаўняе? – спытала Ідэн дзядзьку. Таго, што карміў Лінду і гуляў зь ёю і меркаваў сябе ейным гаспадаром.

– Халера, яшчэ як! – адказаў дзядзька. – А ты думаеш, чаму мы больш ня робім барбікю на заднім дворыку? – ён затыкнуў нос і вымавіў глыбокае „фу-у-у!".

– А можа, мы маглі б завесьці сабаку, які ўмее карыстацца лазёнкай? – упрошвала Ідэн маці.

– А можа ты магла б уцямяшыць у сваю галаву штосьці іншае, акрамя сабакі! Далібог, Ідэн, не дуры мне галавы ўсёй гэтай сабачай балбатнёй. Сабакі ня ходзяць у лазёнку! І не хачу я ніякага сабакі ў маёй купальні. Яны сьмярдзяць!

Ідэн успомніла пра парфуму, што маці вылівала на сябе кожны дзень, – тую, ад якой у Ідэн цяклі сьлёзы і запірала ў горле, і толькі дзіву давалася, як гэта можна ўважаць, што сабакі сьмярдзяць.

– Нам, відаць, ня варта хадзіць зь ёй на „Лэсі вяртаецца дамоў", – сказала неяк маці свайму мужу, лежачы ў ложку. – Яна ж апантаная за гэтымі сабакамі.

Містэр Хавард перавярнуўся на бок і ўздыхнуў:

– Будзь яшчэ рада, што яна ня з тых „конскіх дзяцей", Мэдлін.

– Ты гэта пра што?

– Ну, ведаеш, – ён пазяхнуў у падушку, – тыя дзяўчынкі, што носяцца вакола галопам, і думаюць, што яны – коні. У Фрэда Конара вось такое дзіцё, і яму каштуе цэлую вязанку грошы, каб угаварыць яе зьесьці што-небудзь іншае, акрамя яблыкаў і цукровых кубікаў. Кажа, яна нават набыла сабе нейкія „жавальныя зубы" і больш нічога ня хоча рабіць, адно што іржаць. Ідэн проста ў такой фазе, яна перарасьце гэта. Гэта мая чарга шампуняваць дываны заўтра ці твая?

– Твая, – буркнула місіс Хавард.

„Конскія дзеці"? І дзе ж гэтта ён пабачыў хоць адно такое?

* * *

Ідэнава дзяцінства цяпер далёка. Ёй трыццаць два. Ні дзяцей, ні мужа, толькі псыхіятар.

Некалі яна спрабавала быць вэтэрынарам, але калі прафэсар паклаў перад ёю здохлага пудзеля і заявіў, што яны зараз будуць дзяліць ягоны мозг, яна зьбегла з унівэрсітэцкай лябараторыі і больш туды не вярнулася. О, вядома, яна магла б стаць сабачым цырульнікам ці фатографам, але ж ня кожны можа пераплавіць свой боль у кар'еру.

